Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 44 (2686) Год LII | Беласток, 4 лістапада 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Прыстойная восень

Ілона КАРПЮК

Гран-пры атрымала Дарыя Кадамская

— Шчасце гэтага фестывалю ў тым, што ён не мяняецца, — сказала мне слухачка з Бельска-Падляшскага пасля праслухання праграмы першага дня сёлетняга фестывалю „Бардаўская восень". Ці магчыма, каб гэтая стабільнасць была заадно сімптомам стагнацыі мерапрыемства, якое за год адбудзецца пятнаццаты раз? У днях 26-28 кастрычніка прайшоў чатырнаццаты выпуск фестывалю „Бардаўская восень", які абвяграе сцвярджэнне пра застой.

У 1994 годзе частка беларускай моладзі, аб'яднанай у Звязе беларускай моладзі, вырашыла даць шанц слухачам ды выканаўцам пазнаць самае лепшае на беларускай бардаўскай сцэне. Стала гэта напэўна мастацкай альтэрнатывай для існуючага ўжо фестывалю „Басовішча", хаця, як вядома, у адрозненні да сённяшняга кшталту „Басовішча", тады яшчэ на абодвух сцэнах выступалі Кася Камоцкая, Сяржук Сокалаў-Воюш ці Віктар Шалкевіч. Цікава, што тады не адбыўся падзел на прыхільнікаў аднаго ці другога фэсту. Проста ўсе, хто з пашанай ставіцца да беларускага слова і ўвогуле з'яў беларускай культуры, ездзілі ахвотна і ў Бельск, і ў Гарадок.

Калі так гляджу праз прызму гадоў, не магу не згадзіцца са слушнасцю ідэі заснавання гэтага мерапрыемства, але не магу таксама не пагадзіцца з меркаваннем, што галоўнай прыкметай „Бардаўскай восені" з'яўляецца нязменнасць формы. Можна пра гэта думаць па-рознаму, але калі глянуць за сябе, то акажацца, што сёлетні конкурс у выканаўчым фармаце вярнуўся да вытокаў, а ў якасці зорак выступілі і барды, і, як заўсёды, рокмены з гітарай, нават не акустычнай як гэта найчасцей бывала. Самае папулярнае пытанне: у які бок ідзе фестываль, якая яго будучыня? Але чаму пытаць пра будучыню, калі такая прыгожая сучаснасць. Прыгажосць — гэта слова, якое найчасцей паяўлялася ў сёлетніх ацэнках чатырнаццатага выпуску фестывалю.

— Перш за ўсё сёлетні фестываль прыгожы, святло, дым, сцэна, рэжысура... — так схіляўся над фэстам Зміцер Вайцюшкевіч, чарговы раз у журы, як сам кажа, „можа ў журы конкурсным, не фестывальным". Ён, так як усе вартасныя бардаўскія выканаўцы, адводзіць увагу кожнаму слову, а гэта не менш важнае, каб без сэнсу не кідаць слоў на вецер, а проста спыніцца на хвіліну ў жыцці і пабачыць з якой мэтай заснаваная „Бардаўская восень". Ва ўсялякіх інтэрв'ю, ці гэта Кася Камоцкая, Алесь Камоцкі ці Лявон Вольскі карыстаюцца аднымі і тымі ж словамі, што гэты фестываль будуе яго атмасфера, што гэта месца для сустрэч з людзьмі, канкрэтнымі людзьмі, якія вядома, што паявяцца. Ці не чуваць тут нейкай наўмыснасці з боку ідэйных бацькоў фестывалю? Сёння арганізатары даволі часта кажуць, што бельская сцэна дзеля таго, каб беларускія барды, музыкі і мастакі слова мелі месца для выступленняў, не абмежаванае „немастацкімі" законамі, што гэта таксама форма дапамогі музыкам з Беларусі. Але меркаванні паказваюць, што ў дачыненні да гэтага мерапрыемства такія фармулёўкі далёка ззаду за сапраўднымі патрабаваннямі ўдзельнікаў фестывалю, з абодвух бакоў, са сцэны і з глядзельнай залы. Гаворка ідзе пра меланхалічнасць, настрой, у чым барды адметныя. Гісторыя фестывальных канцэртаў павярнула кола. Як заўжды пачалося з песні Алеся Камоцкага, але гэта сапраўды добрая і пажаданая традыцыя. Ідучы праз фестываль,

працяг ☞ 12

Запіс на студыё Рэмбрандт Радыё Беласток атрымаў дуэт „Босае сонца"

Узнагароду бельскай беларускай суполкі атрымаў Тамаш Суліма

Новыя выклікі ☞ 2

Яўген ВАПА

У адрозненні ад палітыкаў мы, рэдакцыя „Нівы", хочам справіцца са сваімі абяцаннямі перад найважнейшым для нас выбаршчыкам, значыць, чытачамі (кожны тыдзень, а не раз у чатыры гады). Калі пад канец мінулага года ў якасці святочнага падарунка выдалі мы нашу газету каляровай, тады паабяцалі, што пастараемся, каб такіх выданняў было больш...

Выбары-2007 ☞ 3

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Калі б беларусы пайшлі ў апошніх парламенцкіх выбарах самастойна, маглі б разлічваць на два, а можа нават і на тры мандаты ў Сейме, вядома, калі б такі самастойны выбарчы камітэт перавысіў мінімальны выбарчы бар'ер. Так як гэта было ў выпадку нямецкай нацыянальнай меншасці. У Апольскім ваяводстве нямецкі камітэт атрымаў 8,81% галасоў. Агулам дванаццаць стараючыхся за мандат у гэтую палату кандыдатаў, якія выводзяцца з беларускага асяроддзя і балатаваліся са спіскаў чатырох груповак, атрымалі гэтым разам 50 719 галасоў...

Музыка душы ☞ 5

Міхал МІНЦЭВІЧ

Лук'янюкова хата ☞ 9

Міра ЛУКША

Канец дрэваапрацоўчай Гайнаўшчыны? ☞ I

Аляксей МАРОЗ

У права-левым свеце

Светлай зайздрасцю пераймаемся мы, беларусы метраполіі, да суседзяў. Канешне, далёка не ўсё ў парадку на прылеглых тэрыторыях. Але бясспрэчна адно — там віруе жыццё ў розных яго праявах. Выбары на Украіне, выбары ў Польшчы — жарсці і спрэчкі, шчырасць і інсінуацыі, папулізм і канкрэтныя праграмы, сапраўдны выбар са стракатага спектра прэтэндэнтаў. Урэшце, непрадказальнасць вынікаў галасавання і іх наступстваў. Адным словам, жывы працэс з рэальным удзелам, а значыць і ўплывам кожнага канкрэтнага чалавека, ахвочага выявіць сябе ў выбарчай кампаніі, ці, прынамсі, хоць бы галасаванні. У нас, у Беларусі, мала хто ведае палітычны расклад і замежных палітыкаў. У нас не ведаюць нават прэзідэнтаў суседніх дзяржаў. Забаўна было слухаць, як каментатар, чалавек досыць адукаваны і кампетэнтны, падчас матча Беларусь — Латвія ўпарта называў прэзідэнта Валдзіса Затлерса бацькам адной з баскетбалістак.

Апошнія дэмакратычныя выбары ў Беларусі прайшлі 12 гадоў таму — выбары ў мясцовыя саветы 1995 года. Пасля гэтага краіна пакацілася па запланаваным рэчышчы. І па вялікім рахунку да Беларусі ў сённяшнім палітычным свеце няма вялікай справы. Як казаў літаратурны класік: „Ратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў". Беларусь кінутая заходнім светам (у першую чаргу еўрапейскім) на эксперымент. На фізічнае і маральнае выжыванне. Нашы наіўныя спадзяванні на Нобелеўскую прэмію для каго-небудзь з беларусаў (розум не верыў, а сэрцы перад абвяшчэннем вынікаў усё роўна трымцелі) канешне не спраўдзіліся. Уяўляеце, што б атрымала беларуская творчая эліта, пісьменнікі, каб „нобеля" далі ў свой час Васілю Быкаву, ці зараз Рыгору Барадуліну (лішне казаць, колькі, прыкладам, палякам дало прызнанне Чэслава Мілаша і Віславы Шымборскай)? Гэта была б агромністая дапамога Беларусі, вялізная маральная сатысфакцыя і перамога Беларускага Слова, якое так зацята, паслядоўна, з нянавісцю вынішчаюць у нашай краіне прыхадні і манкурты. Ці каб прэміяй уганаравалі намінаваных Алеся Бяляцкага альбо Станіслава Шушкевіча? Як вырас бы аўтарытэт дэмакратычнай апазіцыі ў вачах беларускіх грамадзян. Але амаль ніхто на Захадзе не хоча дапамагаць Беларусі па-сапраўднаму, без імітацыі падтрымкі і свайго меркантыльнага разліку.

У сённяшняй правай-левай еўрапейскай рэчаіснасці недасведчанаму чалавеку арыентавацца надзвычай цяжка. Чытаючы навіны ў прэсе ці Інтэрнэце, сутнасць з'яў можна зразумець толькі між радкоў. Прыкладам, на зусім нядаўніх парламенцкіх выбарах у Швейцарыі выйгралі кансерватары, якіх многія мас-медыі паспяшаліся назваць відавочна з адмоўным сэнсам „нацыяналістамі" і „ультра-правымі". Швейцарская народная партыя ўпэўнена перамагла найбуйнейшую па колькасці сацыял-дэмакратычную партыю. І гэта значыць, што швейцарскаму народу пашанцавала, бо сапраўдныя правыя заўсёды пільнуюць не толькі агульнадэмакратычныя каштоўнасці, але і нацыянальныя вартасці і здабыткі. А вось такія „правыя", як зараз у Расіі, нішчаць і свой народ, і прадстаўнікоў іншых нацый (штотыдзень з Расіі прыходзяць звесткі пра забойствы паводле расавай і нацыянальнай прыкмет, не кажучы ўжо пра ўкаранёны паўсядзённы шавінізм).

Шляхам нішчання нацыянальнай і еўрапейскай тоеснасці пайшлі зараз іспанскія левыя (французскі сумны досвед нічому не вучыць!). З гэтага часу выхадцы з Афрыкі ў Іспаніі прыроўнены ў працоўных правах да грамадзян з краін Еўрасаюза з усімі наступствамі. Пакуль гэта датычыць толькі працаўладкавання ў футбольных камандах. Але як ёсць пачатак, будзе і канчатак. Сёлета іспанскі сацыял-дэмакратычны ўрад ратыфікаваў так званае катонскае пагадненне (падпісанае ў 2000 годзе ў бенінскім горадзе Катону). І па сутнасці гэта азначае капітуляцыю перад нелегальным нашэсцем афрыканцаў на Пірэнейскі паўвостраў.

Што ж датычыць больш блізкіх спраў — а менавіта істотных змен у польскім урадзе, то, мяркую, кардынальных змяненняў у палітыцы Польшчы ў дачыненні да Беларусі не адбудзецца. Ні ў горшы, ні ў лепшы бок. Горш не будзе, а лепшага мы ўжо ні ад каго не спадзяемся.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Новыя выклікі

Парламенцкія выбары за намі. Перад жыхарамі польскай дзяржавы шчаслівая будучыня. Згодна з абяцаннямі Грамадзянскай платформы, якая выйграла выбары, неўзабаве нас усіх чакае цуд, бо на гэта мы проста заслугоўваем. Мама аднаго майго сябры, слухаючы і аглядаючы перадвыбарчыя лозунгі жыццярадасных абяцаннікаў, якія захацелі стаць абраннікамі, з належнай павагай і надзеяй каментавала гэта ўголас словамі: „Дай Божа". Ёй, як і ўсім звычайна думаючым людзям, становіцца ясным, што ўсё нажытае грамадствам гэта толькі і выключна вынік іхняй цяжкай працы, а не чакання здзяйснення палітычных абяцанак. Памятаем хіба польскую прыказку: „Абяцанкі-цацанкі, а дурному радасць", або нашую: „Спадзяваўся дзед на мёд, то лёг спаць не еўшы".

У час выбарчай гульні мяне асабіста ўразіла стаўка на вельмі моцны папулісцкі ход на лістоўках і білбардах Грамадзянскай платформы, націск іхніх кандыдатаў на слова „ўсім". Быццам, усім — усё. У маім свабодным перакладзе з палітычнай мовы на звычайную гамонку абазначае гэта: „Нікому нічога. Нам усё". Добра з недалёкага мінулага яшчэ памятаем, што гаварылі людзі пра тое і тых, якія захацелі стварыць сістэму, у якой, напрыклад, зямля ці прадпрыемствы мелі стаць усенароднай уласнасцю. Выбарчы лозунг пераможнай партыі „Каб жылося лепей. Усім", якая сама сябе называе здаровай цэнтра-ліберальнай групоўкай, лічу звычайным выбарчым хуліганствам у дачыненні да выбаршчыкаў. На жаль, такая ў нас зараз праўда, што без палітычнага хуліганства і ашуканства не можна стаць пераможцам на выбарчых гонках. Хаця з гэтым бывала парознаму. Сённяшнім лідэрам Грамадзянскай платформы, у недалёкім мінулым былым палітыкам Ліберальна-дэмакратычнага кангрэса, якія ў 1993 годзе ішлі на выбары пад лозунгам „Мільён новых месц працы", раней пакіраваўшы прыватызацыяй у краіне, хочацца прыгадаць чым гэта закончылася для грамадства і для іх асабіста. Мільёны прыватызацыйных ахвяр папоўнілі тады лік беспрацоўных, уцякаючых з Польшчы ў яшчэ не зусім адкрытую Еўропу. Ці іх таксама запрашалі вярнуцца на Радзіму лідэры Платформы ў час сваіх выбарчых бадзянняў па еўрапейскіх сталіцах? Неяк, дзіўным чынам, не згадвалася і гэтае пакаленне, і той перыяд выездаў у сённяшніх выбарчых роліках. У 1993 годзе выбаршчыкі адправілі Дональда Туска і яго кампанію з Сейма за фальшывыя абяцанні. Спадзяюся, што будучы прэм'ер не забыў тадышняга ўрока гісторыі. Інакш на наступных выбарах абяцанае шчасце для ўсіх можа ізноў давесці да няшчасця для кіруючай партыі. Але пакуль што крэдыт даверу для чарговых пераможцаў у грамадстве вялікі і дай ім Божа справіцца хаця б з часткай абяцанняў. Пра выбары на нашым падляшскім панадворку і іх паслядоўнасцях для беларускай меншасці прачытаеце на старонцы побач.

У адрозненні ад палітыкаў мы, рэдакцыя „Нівы", хочам справіцца са сваімі абяцаннямі перад найважнейшым для нас выбаршчыкам, значыць, чытачамі (кожны тыдзень, а не раз у чатыры гады). Калі пад канец мінулага года ў якасці святочнага падарунка выдалі мы нашу газету каляровай, тады паабяцалі, што пастараемся, каб такіх выданняў было больш. І менавіта ад імя ўсёй рэдакцыі маю вялікі гонар паведаміць, што найбліжэйшыя пакуль два месяцы, Шаноўныя Чытачы, будзеце атрымоўваць „Ніву" ў такім выглядзе, які трымаеце цяпер у руках. Што будзе ў 2008 годзе пакуль невядома, але трэба спадзявацца, што „Ніва" застанецца ў такім выглядзе і далей. Але вялікая тут менавіта роля Вас, нашы Дарагія Чытачы. Калі будзе пашырацца падпіска і продаж тыднёвіка, калі з'явіцца на нашых старонках пастаянная рэклама Вашых фірмаў, калі самаўрады свае платныя аб'явы дадуць пачытаць сваім жыхарам на беларускай і на польскай мовах — то ўсе разам будзем цешыцца, што „Ніва" і беларуская справа на Беласточчыне будуць залежаць не толькі ад вынікаў выбараў у маштабе краіны.

Яўген ВАПА

Вачыма еўрапейца

Аб лісіцы-хітрыцы

Еўропу абабегла інфармацыя, што Беларусь дала згоду на адкрыццё прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі. На інтэрнэтных старонках Фонду „Еўрапейскі закон" можна было прачытаць: „На працягу апошніх трох месяцаў прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка некалькі разоў выказаў волю паправы адносін з Бруселем. У прамове перад беларускім парламентам пацвердзіў гатоўнасць да таго, каб быць роўным і адказным партнёрам". Падобна як еўрасаюзныя прадстаўнікі і я не веру гэтым гарантыям. Прыгадаў я словы, якія летам у размове са мною выказаў прэзідэнт Лех Валэнса, калі я спытаўся ў яго, ці пры прэзідэнце Аляксандры Лукашэнку Беларусь можа быць незалежнай краінай. Адказаў ён мне тады: „На маю думку, ён не кажа таго, што думае сапраўды. Прытвараецца лісіцай-хітрыцай". І зараз дадаў: „Спадар Лукашэнка спачатку прабуе выдаіць Маскву, пасля спрабуе зарабіць на Захадзе". І так сабе думаю, што дэкларацыі прэзідэнта Лукашэнкі аб супрацоўніцтве з ЕС, м.інш. згода на адкрыццё бюро ЕК упісваюцца ў такое мышленне. Расія ў апошні час цвёрда трымаецца стратэгіі рэальных цэн, м.інш., газу. Палохала, што завінціць краны. Мабыць, прэзідэнт Лукашэнка ў сувязі з такой тактыкай Расіі хоча ёй паказаць, што зможа без яе абысціся, значыць — прымяняючы моднае ў Польшчы слова — дыверсіфікаваць сваю замежную палітыку. Гатовы ён на нейкія ўступкі, больш касметычнага характару, чым на дэмакратычныя перамены. Робіць гэта — вось як у выпадку Еўрапейскага маршу — меўшы ў памяці заяву з лютага, напрыклад, генеральнага дырэктара дэпартамента знешніх адносін ЕК Энека Лэндбаро аб гатоўнасці назначэння Беларусі фінансавай і тэхнічнай падтрымкі ўзамен за „нейкае паслабленне" палітычнага рэжыму ў краіне.

Аляксандр Лукашэнка высылае сігналы, запускае свайго роду прынады. Адначасова ў дачыненні да такога члена ЕС як Польшча вядзе зусім іншую палітыку. Не ўпускае, напрыклад, польскіх парламентарыяў і некаторых журналістаў на беларускую тэрыторыю. Да таго пасля забароны ўезду тагачаснага старшыні Грамадзянскай платформы Дональда Туска і віцэ-маршалка Сената Кшыштафа Путры прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ганарліва выкрыкваў: „Далі ім па мордзе, і слушна".

Адначасова вуснамі Марыі Ваньшынай з мінскага МЗС (такога Ежы Урбана, прапагандыста і прэс-інфарматара з часу ваеннага становішча ў Польшчы) заяўляе: „Беларусь адкрыта на будаванне карысных для абодвух бакоў, раўнапраўных і добрасуседскіх адносін з Польшчай. Мы вітаем кожны візіт афіцыйных польскіх прадстаўнікоў у нашу краіну ў канструктыўных намерах". Таму не разумею, як у гэтым кантэксце растлумачыць факт цяжкасцей польскага пасла ў Мінску Генрыка Літвіна з уручэннем беларускаму прэзідэнту даверчых грамат. Мінаюць ужо месяцы, пасля паўтара года з назначэння яго на гэтую пасаду, калі пасол Літвін прабывае ў Мінску. Апошняя заява аб уручэнні такіх грамат, якія дазваляюць на афіцыйную дзейнасць, датычыць снежня, месяца, у якім таксама мае наступіць адкрыццё бюро Еўрапейскай камісіі, пасля паўтарагадовай „каардынацыйнай працэдуры".

Так вось прэзідэнт вядзе свае гульні — як гэта назваў Лех Валэнса — лісіцы-хітрыцы. Згоду на адкрыццё бюро ЕК можна ж адмяніць, калі яму толькі штосьці не спадабаецца. Нярэдка цяжка прадбачыць калі і канкрэтна што можа яму не спадабацца. Урэшце ж створаная ім беларуская дзяржаўная сістэма абапіраецца на капрызнасці або — як гэта называе моладзь — на „стралянні фохаў".

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Выбары-2007

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Калі б беларусы пайшлі ў апошніх парламенцкіх выбарах самастойна, маглі б разлічваць на два, а можа нават і на тры мандаты ў Сейме, вядома, калі б такі самастойны выбарчы камітэт перавысіў мінімальны выбарчы бар'ер. Так як гэта было ў выпадку нямецкай нацыянальнай меншасці. У Апольскім ваяводстве нямецкі камітэт атрымаў 8,81% галасоў. Цікава, што паўторна дэпутатам Сейма не стаў Генрык Кроль (падтрымала яго толькі 7 897 або 2,14% выбаршчыкаў), а адзіным паслом стаў Рышард Галля (8 193 або 2,22%). Нямецкую меншасць падтрымалі 32 462 выбаршчыкі.

Агулам дванаццаць прэтэндэнтаў стараючыхся на мандат у гэтую палату, якія выводзяцца з беларускага асяроддзя і балатаваліся са спіскаў чатырох груповак, атрымалі гэтым разам 50 719 галасоў. Канчаткова дэпутатамі Сейма сталі Яраслаў Матвяюк і Яўген Чыквін (абодва балатаваліся са спіска ЛіД).

Яраслаў Матвяюк

Несумненна, аб выбарчым поспеху можа гаварыць доктар Яраслаў Матвяюк, беспартыйны, юрыст-канстытуцыяналіст. Атрымаў ён найлепшы вынік, падобна як у яго выпадку было ў час апошніх выбараў у Падляшскі самаўрадавы сеймік. Пасля выбарчай нядзелі сказаў ён „Ніве":

— Я тлумачу свой вынік спакойнай і мерытарычнай кампаніяй, у якой я паказваў на рэальныя праблемы публічнага жыцця ў Польчшы. Усе каштоўныя і трапныя ідэі кааліцыі ГП-ПСЛ будзем падтрымліваць. Ёсць шмат спраў юрыдычнай натуры, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Калі гаворка непасрэдна аб беларускім, праваслаўным асяроддзі, я буду хадайнічаць за павелічэнне сродкаў для арганізацый, якія яго прадстаўляюць і за інвестыцыі на тэрыторыі, дзе яно пражывае. Хачу працаваць у камісіі па ўнутраных справах і адміністрацыі. Ведамства МУСіА непасрэдна рэальна займаецца меншасцямі і дбае пра бяспеку жыхароў, што блізкае маёй юрыдычнай адукацыі.

Яўген Чыквін, дэпутат звязаны з СЛД, з дваццацігадовым парламенцкім стажам, галоўны рэдактар штомесячніка „Przegląd Prawosławny", распытваны намі пра тое, ці ў цяперашняй канфігурацыі ў Сейме лягчэй ці цяжэй будзе змагацца за справы беларускай меншасці, сказаў:

— Спадзяюся, што ў ГП і ПСЛ, хаця пераважная большасць гэтай апошняй групоўкі ў папярэднім скліканні выказалася супраць закону аб нацыянальных меншасцях, маецца свядомасць, што менавіта гэты закон і закон аб адносінах з Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквой дапамогуць будаваць у свеце вобраз Польшчы — краіны адкрытай у дачыненні да нацыянальных меншасцей. Разлічваю на тое, што не будзе так як у папярэдніх двух гадах, калі грошы для меншасных арганізацый прызначаліся кан'юнктурна.

Пасол Чыквін свой шматгадовы выбарчы поспех тлумачыць словамі апостала Паўла, які прапаведаваў, што трэба дапамагаць усім, але асабліва братам па веры. Намерваецца ён паўторна засядаць у сеймавых камісіях нацыянальных і этнічных меншасцей ды культуры.

Гісторык, праф. Антон Мірановіч (стартаваў ад ПСЛ), у якога „Ніва" спыталася ці, нягледзячы на паражэнне, варта было балатавацца, заявіў:

— Варта, хоць мой вынік — неімпазантны. Мы стварылі, аднак, альтэрнатыву. Я расчараваны пазіцыяй беларускіх арганізацый, якія не ангажаваліся ў гэтыя выбары. Калі глядзець на вынікі выбараў, аказалася, што найбольш выбаршчыкаў з беларускага, праваслаўнага асяроддзя ўсё звязана з посткамуністычнай лявіцай. Не прыкмячаюць яны, што ў Польшчы адбываюцца змены. Відаць таксама, што ў Падляшскім ваяводстве сама СЛД падпіраецца праваслаўным асяроддзем.

Марк Масальскі, дырэктар Праваслаўнага асяродка міласэрнасці „Eleos" (стартаваў са спіска ГП) так пракаментаваў свой выбарчы вынік:

— Я лічу, што пры такой канкурэнцыі мой вынік быў неблагі. Напэўна, варта было спрабаваць, бо і шанцы былі вялікія, хоць канчаткова гэта, вядома, параза. Зноў аказалася, што нашаму асяроддзю бліжэйшы левы напрамак. Незалежна ад гэтага, цешуся, што яго прадстаўнікі маюць двух дэпутатаў.

У сваю чаргу Мікалай Яноўскі (ПСЛ), падляшскі віцэ-маршалак, пасля выбараў сказаў:

— Мой вынік вельмі слабы. Тлумачу гэта фактам, што была нізкая прысутнасць. Не ўмелі мы пераканаць усіх беларусаў, каб пайшлі на выбары.

Віцэ-маршалак Яноўскі, распытваны пра тое, ці ўтрымаецца ў Падляшскім сеймику кааліцыя ПіС-ПСЛ, калі на парламенцкім і ўрадавым узроўні ўзнікне кааліцыя ГП-ПСЛ, загадкава тлумачыў:

— Тое, што мае ўзнікнуць кааліцыя ГП-ПСЛ, дык гэта добрае прадказанне. Як будзе пасля ў нас, пабачым.

Яўген Чыквін

Дзень да выбарчай цішыні Беласток наведала двое з адзінаццаці (з дзевяці краін) гасцюючых у Польшчы назіральнікаў ад Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Юрыдычныя аналітыкі ўкраінка Іна Шырокава і амерыканец Рычард Бэйнтэр сустрэліся з працаўнікамі Гарадской управы, якая арганізавала выбары, шэфам дэлегатуры Краёвага выбарчага бюро, старшынёй Акруговага суда, дзеячамі ГП і ПіС. Мелі таксама наведаць Владзімежа Цімашэвіча, як сказалі, паколькі гэта незалежны кандыдат. Аднак, на гэтую сустрэчу не хапіла ім часу. На нацэлую гадзіну зайшлі яны таксама ў адну рэдакцыю ў Беластоку — у рэдакцыю „Нівы". Цікавіліся м.інш. удзелам беларусаў у выбарах і агульнай ацэнкай давыбарчай сітуацыі. Пары назіральнікаў удалося паставіць некалькі пытанняў. Іна Шырокава адказала:

— Нашай мэтай у Беластоку і ўва ўсёй Польшчы з'яўляецца сустрэча з як найбольшым лікам асоб, у тым ліку з прадстаўнікамі палітычных партый і адміністрацыі. Наша місія мае ацаніць ход выбараў. Цікавяць нас юрыдычныя пытанні звязаныя з выбарамі, спосабы іх прымянення, магчымасці падавання выбарчых скаргаў.

Чаму выбралі таксама „Ніву" на сваім беластоцкім назіральніцкім шляху?

— Прадстаўнікі місіі чулі шмат аб беларускай меншасці на гэтай тэрыторыі Польшчы. Алістэр Рабальяці (вядомы ў свеце навуковец і пісьменнік — рэд.) пазнаёміўся калісьці з галоўным рэдактарм „Нівы", заадно старшынёй Беларускага саюза ў РП Яўгенам Вапам і рэкамендаваў нам такую сустрэчу.

На пытанне, ці гэта добра, што прэзідэнт Беластока ангажаваўся ў выбарчую кампанію адной партыі хоць бы ўдзельнічаючы ў яе давыбарчых прэс-канферэнцыях, а віцэ-прэзідэнт балатуецца са спіска тае партыі ў Сейм, а адначасова Гарадская ўправа з'яўляецца арганізатарам выбараў, Іна Шырокава сказала са здзіўленнем:

— Гэта для нас новая інфармацыя.

Рапарт назіральнай місіі ў справе парламенцкіх выбараў мае быць падрыхтаваны на працягу двух месяцаў.

І на канец выбарчая цікавінка. У польскім пасольстве ў Мінску — так як у дыпламатычных прадстаўніцтвах ва ўсім свеце — таксама праводзілася галасаванне. Права голасу мелі тут 149 выбаршчыкаў, з якіх прагаласавалі 93 асобы. Найбольш, бо 52 выбаршчыкі, выказаліся за ГП. Ніхто не прагаласаваў на Самаабарону. У Сенат больш за палову галасуючых падтрымала рэжысёра і дырэктара варшаўскага тэатра „Сірэна" Барбару Борыс-Даменцкую, якая балатавалася са спіска ГП (замежныя выбаршчыкі галасавалі на варшаўскі спісак), якая, дарэчы, здабыла ў сенацкім маштабе найлепшы вынік — больш за 600 тысяч галасоў.

Лік галасоў, якія набралі беларускія кандыдаты:

Спісак н-р 8 (ГП)
Масальскі Марк — 5 031
Мантур Мікалай — 2 699

Спісак н-р 10 (ПСЛ)
Яноўскі Мікалай — 3 502
Мірановіч Антон — 943
Нестэрук Уладзімір — 154

Спісак н-р 15 (Самаабарона)
Гаўрылюк Мікалай — 524
Цішук Ірэна — 114

Спісак н-р 20 (ЛіД)
Матвяюк Яраслаў — 20 770
Чыквін Яўген — 14 234
Чыквін Мікалай — 1 945
Грыцук Анна — 564
Навіцкі Анатоль — 239

Разам — 50 719 галасоў

Весткі з Ляўкова

Злачынцаў трэба караць

Мне гаварылі, што ў Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) шырыцца хуліганства і зладзейства сярод няпоўналетняй моладзі, якая пражывае перш-наперш у тамашніх жылых шматсямейных блоках. Мой знаёмы быў у блоку і на хвіліну адышоў ад свайго новенькага веласіпеда і больш ужо яго не ўбачыў. Мой пляменнік паехаў у Старое Ляўкова навейшым роварам сваёй маці, дык яму падмянілі яго на куды горшы, як кажуць, на „злом" — ён нават дадому на ім не даехаў!

Яшчэ мне расказалі, што некаторыя стараляўкоўскія юнакі неахвотныя да навукі і некаторыя не вучацца ў школе. Яны ахвотныя да выпіўкі. Выпіўшы ў пленэры недзе за вёскаю, напрыклад, каля рыбных ставаў за керамічнай фабрыкай, кідаюць камяні цаляючы ў паплаўкі вудзільшчыкаў. Калі збяруцца ў грамадзе, неабходна абмінаць іх здалёк — можна дастаць у капшук. Адзін хлапец, здавалася б такі спакойны, у белы дзень заняўся цясляркай, часаў драўляныя слупкі трохсценнай пачакальні на аўтобусным прыпынку ПКС у Старым Ляўкове. Чамусьці апякуецца ім ягоная бабця ў блоку.

21 кастрычніка г.г. я паехаў роварам на выбары ў святліцу ў Старым Ляўкове (яна насупраць жылых блокаў). Працаваў у выбарчай камісіі. Познім вечарам мой веласіпед не надаваўся да язды. Хуліганы паламалі ды пагнулі спіцы, пагнулі абручы колаў, дасталася таксама вентылям. Вось такое варварства! Паведаміў я аб гэтым паліцыю. А яна — дай сведкаў. Найлепш было б, каб прывёў ім хулігана за ручку. Ну і мая справа — дрэнь. Мінулі ўжо два тыдні. Участковы не цікавіцца, не прыязджае. **(ян)**

1 300 м новых тратуараў

Яшчэ да парламенцкіх выбараў, у Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет), закончылі пабудову значнага адрэзка тратуараў з брусчаткі. Гэта павятовая дарога, але ўлады Нараўчанскай гміны купілі брусчатку і бардзюры за 50 тысяч злотых.

Варта адзначыць, што новы тратуар у Старым Ляўкове — гэта заслуга перш-наперш раднага з Ляўкова Яна Целушэцкага. **(мох)**

Запрашэнне да конкурсу

У гэтым аглядзе могуць прыняць удзел усе ахвотныя паўналетнія творцы-аматары. Кожны ўдзельнік павінен прынесці ад трох да пяці пластычных прац — малюнкі, графікі, рысункі, рэзьбы, мастацкія тканіны, інтарсіі і працы ў іншых тэхніках.

Агляд непрафесіянальнага мастацтва Гайнаўскай зямлі арганізуе ўжо чатырнаццаты раз Гайнаўскі дом культуры. Сёлета працы будуць прымаць да палавіны лістапада.

Выстаўка найлепшых прац будзе адкрыта ў пачатку снежня г.г. у Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы па вул. 3 Мая, 42. Пераможцы атрымаюць узнагароды. **(ян)**

Медалі — для бельскай тройкі

Юрка Чыквін са сваімі маладымі спартсменкамі

фота Ілоны КАРПЮК

Ілона КАРПЮК

— Каб расказаць пра нашы дасягненні трэба было б сесці надаўжэй, адкрыць хроніку...

Свеціць прыемнае сонца, але калі выходжу з машыны холад напамінае, што гэта аднак восень. 20 кастрычніка 2007 года, іду лесам, тапчу жоўтую лістоту. Гэта яшчэ Беласток, але здаецца мне, што тут амаль так як у маёй Лядскай пушчы. Аднак штохвіліны мінаюць мяне маладыя людзі ў спартыўных касцюмах. Гэта ж субота, самы лепшы дзень для ўсялякіх спаборніцтваў. Так, сама помню са школьных гадоў, тады проста не траціцца заняткаў. З глыбіні чутны голас з мегафона... На месцы не цяжка знайсці ўдзельнікаў, якіх шукаю. Ва ўсіх на чырвоных блузах красуецца вялікі белы надпіс: ТРОЙКА. Неспадзявана, пасля абмену некалькімі сказамі, дзяўчаты падыходзяць і вітаюць мяне: „Пані з «Нівы»!" Не ведаю як мяне так хутка распазналі, але самае галоўнае, што чытаюць „Ніву". Выдалі сябе таксама напрыканцы сустрэчы, пытаючы пра вынікі крыжаванкі і пра тое, калі прачытаюць пра сябе. Аказваецца, што „Ніву" чытаюць не толькі яны самі, але часам і іхныя бацькі ды бабулі на вёсках. Там і гавораць па-свойму.

— Нават бацькі часам у хаце па-свойму сварацца, — дадае адна з дзяўчынак, — хіба дзеля таго, каб мы не разумелі, а мы і так ведаем сваё, — усміхаецца.

Па-беларуску ім, пяці-, шасцікласнікам, пакуль што цяжка размаўляць, затое ў спорце не баяцца ніякай канкурэнцыі. Хаця бельская „тройка" хутчэй па характары беларуская школа, то ў ваяводстве і ў спорце цяжка з імі раўняцца. Дзяўчаты не баяцца нават спартыўных школ.

Не паспееш азірнуцца, а ўжо па ўсім. Адзінаццаць энергічных маладых спартсменак з бельскай „тройкі" вяртаецца з Беластока ў свой горад з чарговым поспехам. Кася Старчэўская, Магда Гаркава, Аня Клімчук, Канстанцыя Дораш, Дыяна Пагажэльская, Магда Рыжык, Оля Рамановіч, Магда Маліноўская, Юлія Панютыч, Паўліна Іванюк ды Паўліна Федарук чакаюць толькі, калі трэнер пазвоніць дырэктару школы і перакажа яму добрыя весткі! Бронзавы медалі красуюцца на іх грудзях. Рэзервовай спартсменцы свой медаль аддаў трэнер. Правілы не прадбачваюць больш чым дзесяць удзельнікаў у камандзе, а, вядома, як у жыцці бывае, асабліва ў калектыўных відах спорту. Траўмы гэта штодзённасць...

— Сёння дзве дзяўчынкі беглі траўміраваныя, таму вельмі патрэбная была яшчэ адна, на ўсякі выпадак. На шчасце нічога кепскага не здарылася.

Кантузіі бываюць, але натуральным наступствам гэтага з'яўляецца вялікая стомленасць. Дзяўчынкі прыбеглі да мэты ледзь трымаючыся на нагах, падтрымлівалі адна другую. Дыяна сыходзіла з дарожкі шчаслівая, але са слязамі на вачах. Гэта не чэмпіянат свету, але відаць заангажаванасць дзяўчынак у падыходзе да спаборніцтваў і свайго віду спорту. Таму на тварах перад усім радасць, але і ўпэўненасць, хаця ёсць і хваляванне.

— Хвалюемся цяпер, калі яшчэ не бегаем, але зараз трэба будзе надзець нумар і чакаць старту, — кажа Паўліна Іванюк, якая бегла на апошняй змене.

Але, шчыра кажучы, хваляванне ім сапраўды непатрэбнае. На восем школ, якія прымалі ўдзел у чэмпіянаце Бельскага павета, тры праходзілі далей — „тройка" з першага месца. У чэмпіянаце групы, што адбываўся ў Васількаве, з 24 школ адбор прайшлі толькі дзевяць, у тым ліку і бяльшчанкі.

— Гэта была самая моцная група, — кажа трэнер Юрка Чыквін. — Гэта не таямніца, што на апошнім, ваяводскім этапе найбольшую канкурэнцыю складаюць пераможцы васількаўскай групы. Нашы дзяўчаты, як бачна, пацвердзілі гэтае правіла, — канчае з гонарам.

Трэнер таксама невыпадковы чалавек. Як ён сам сказаў, мы амаль землякі, бо ён родам з Крывятыч. Правінцыйнасць паходжання напэўна не перашкодзіла яму ў развіцці кар'еры. У 1986-1987 гадах гэта быў самы хуткі спрынтэр родам з Падляшша. Трэніраваў ён у клубе „Падляшша" Беласток, пяць гадоў прафесійна бегаў, а як сам кажа, ужо ў падставовай школе ведаў, што будзе займацца спортам. Прайшоў усе школы, закончыў Акадэмію фізічнага выхавання ў Белай-Падляшскай, а пасля, дзякуючы спрыяльнай сітуацыі, трапіў у Падставовую школу н-р 3 у Бельску-Падляшскім, дзе ўжо дзевятнаццаць гадоў вядзе спартыўную адукацыю. Абавязкова трэба дадаць, што паспяхова. Яго падапечныя па лёгкай атлетыцы заўсёды ў ваяводскім фінале, без розніцы ці гэта ліга, чэмпіянат ці эстафета, хаця цяпер у эстафеце гонар школы абаранялі дзяўчаты; хлопцам гэтым разам не пашанцавала. Але гэта пэўна выпадковасць. У штогадовым ваяводскім рэйтынгу „Спартовае спаборніцтва сярод падставовых школ і гімназій" два гады таму бельская „тройка" апынулася на другім месцы, хлопцы былі другія, дзяўчаты трэція. У мінулым годзе было шостае месца, бо хаця хлопцы былі чацвёртымі, дзяўчынкі ўпалі на семнаццатую пазіцыю. Усяляк бывае, аднак бачна якой моцнай у спорце з'яўляецца гэтая школа. Дастаткова паглядзець колькі падставовых школ у ваяводстве.

Дзе шукаць таямніцу ўсіх гэтых поспехаў? Спаборніцтва ў спорце бярэ пачатак яшчэ са старажытнасці, але да сённяшняга дня яно папулярнае. Навокал поўна дзяцей і таленавітай моладзі, але трэба ім прысвяціць шмат часу.

— Не з кожнага каменя атрымаецца дыямент, — прызнаецца не менш таленавіты трэнер. — Помню, калі я быў вучнем, самым дрэнным днём у тыдні была нядзеля. Проста ў гэты адзіны дзень не было заняткаў у школе і мы не трэніравалі. Ахвота і патрэба займацца была тады вялікай. Сёння ўжо не так лёгка, моладзь стала вельмі выгаднай.

Не толькі моладзь становіцца праблемай. Часцей гэта бацькі спыняюць нармальную працу. Прыходзяць з прэтэнзіямі, што восенню іх дзеці бегаюць па панадворку.

— А калі іх загартоўваць, — дзівуецца Юрка Чыквін, — у гімнастычных залах, дзе займаецца па шэсць груп?

— З дзяўчатамі працаваць цяжэй, з імі трэба больш размаўляць, знаходзіць лепшыя матывацыі, шукаць адпаведныя штуршкі, — дадае трэнер. — Кожны малады патрабуе вонкавай падтрымкі і галоўная роля ў гэтым бацькоў.

Дзяўчатам цяжка нават прыдумаць нейкае іншае зацікаўленне чым спорт, хаця будучыню бачаць па-рознаму.

— Я хіба хачу стаць лекарам, — кажа Канстанцыя, — каб памагаць людзям.

Хтосьці можа стане архітэктарам, але абсалютная большасць будзе спартсменкамі. Кася Старчэўская, якая бегла спачатку, першая адважна пачала расказваць пра свае адчуванні. Прызнаецца яна, што кожны чакае медаля, хоча стаць на подыуме і менавіта адтуль у іх столькі ахвоты і энергіі. І ўсе згодны, што самае важнае гэта сістэматычны трэнінг.

— Пан Юрэк часам крыкне, бывае строгі, калі чагосьці забудзем на трэніроўку або не слухаем, але як трэба — пацешыць, падтрымае на духу, — кажуць дзяўчаты.

Трэнер на гэтыя словы смяецца, але згаджаецца са сваімі вучаніцамі: дысцыпліна і сістэматычнасць патрэбныя.

— Яны трэніруюць два разы ў тыдзень па дзве гадзіны, але апрача гэтага бываюць на іншых трэніроўках. Бачна, што яны поўнасцю заангажаваны, ім проста хочацца.

Музыка цыганскай душы

Міхал МІНЦЭВІЧ

Ромы з'яўляюцца адной з найбольш прыкметных меншасцей у Польшчы. Хаця на Беласточчыне пражывае іх не найбольш, аднак гэта ў Беластоку маем сядзібу Цэнтральнай рады ромаў у Польшчы. Таксама ў Беластоку выходзіць першая ў Польшчы ромская газета „Rrom p-o Drom" (у беларускім перакладзе: „Цыган на ростанях"); выходзіла таксама беларуска-ромская версія газеты — частка ромаў выводзіцца з Крэсаў...

Ромы з'яўляюцца нашчадкамі выхадцаў з Індыі. У Еўропе, у тым ліку і ў Польшчы, пражываюць яны ад пяці стагоддзяў...

Poplątane są taborów drogi,
Poplątane jak cygański los.
My swojego domu wciąż nie mamy,
Lecz jesteśmy świata wybrańcami...

Так гучаць першыя словы цыганскага гімна „Джэлем, джэлем" (у беларускім перакладзе: „Мы вандравалі-вандравалі"), якім ромы пачынаюць і канчаюць свае фестывалі. Гэты гімн быў устаноўлены 8 красавіка 1971 года ў час I сусветнага кангрэса ромаў у Арпінгтан пад Лонданам. Гербам ромаў з'яўляецца чырвонае кола табарнага воза на блакітна-зялёным фоне. Сімвалізуе яно вандроўку і тугу па ёй.

Большасць ромаў з'яўляецца каталікамі. Аб'яднанне польскіх ромаў штогод ладзіць „Табар памяці" па маршруце брацкіх магіл сваіх суродзічаў, памардаваных у перыяд II сусветнай вайны; апошнім пунктам маршруту з'яўляецца Шчурова каля Тарнава. I штогод 2 жніўня ў Асвенціме-Бжэзінцы адбываецца мемарыяльнае мерапрыемства ў гадавіну пагібелі ромскага лагера. Праз больш чым 50 гадоў нямнога згадвалася пра ромскую мартыралогію.

Паводле даных Міністэрства ўнутраных спраў, у Польшчы пражывае 30-50 тысяч ромаў (не ўлічваючы прышэльцаў з Паўднёвай Еўропы). Найбольш іх на поўдні краіны, а ў Падляшскім ваяводстве — каля тысячы. Ромы былі прымушаны адмовіцца ад вандроўнага жыцця і пачалі сяліцца ў 1960-х гадах пасля забароны польскімі ўладамі табарнага руху.

У нашым ваяводстве цыганы пражываюць у большасці гарадоў рэгіёна. У Беластоку, у блоку, дзе жыве Станіслаў Станкевіч — галоўны рэдактар „Rrom p-o Drom" і віцэ-старшыня (адзін з трох) Сусветнай рады ромаў, пражывае больш трыццаці ромскіх сем'яў. Большасць цыганоў з Сувалкаў выехала ў замежжа, найбольш у Германію і Вялікабрытанію; асталася жменька (у 1999 годзе ў Сувалках здараліся выпадкі пераследу цыганоў). Як сцвярджае Станіслаў Станкевіч, старшыня Цэнтральнай рады ромаў у Польшчы, якая мае сваю сядзібу ў Беластоку, выезд у іншыя краіны, пакідаючы магілы сваіх памерлых, з'яўляецца крайнасцю і такая мера прымаецца толькі ў выпадку смяротнай небяспекі.

У 1991 годзе каталіцкі настаяцель у Сувалках заснаваў прыхадскую пачатковую ромскую школу з трохгадовай праграмай навучання, але шмат цыганскіх дзяцей нават і гэтага не адольвае. Дырэктар школы Яцак Мілеўскі не з'яўляецца ромам, але ромскую мову ведае.

Цыганы пражываюць таксама ў Сейнах, Элку, Пішы, Ломжы... У Сямятычах сем гадоў таму пражывала трыццаць пяць асоб у дзевяці ромскіх сем'ях; з таго часу маладыя выехалі на працу ў Бельгію. Жывуць цыганы таксама ў Бельску-Падляшскім, Гайнаўцы і спарадычна па вёсках.

Фота Міхала МІНЦЭВІЧА

„Цыганскія чары" ў Орлі; Алена Руткоўская ў цэнтры

Цыганы жывуць край нас гадамі, але мы ўсё яшчэ мала ведаем пра іхняе грамадства. I гэтае няведанне стварае бар'ер, праз які складана наблізіцца да цыганоў. Хаця ў нашым ваяводстве суіснуюць шматлікія культуры і нацыянальнасці, аднак ніводная самаўрадавая ўстанова не заўважыла патрэбы ўстанаўлення кансультанта па справах мяншынь.

Шануючы другога чалавека трэба таксама заўважыць, што многія цыганы з'яўляюцца здольнымі і працавітымі людзьмі, да таго ж выдатнымі спецыялістамі па многіх галінах побыту. Прыгадваю, што калісь арлянскай пякарні пагражала закрыццё з прычыны счэзласці ахоўнага пласта ў катлах для замешвання цеста. Доўга шукалі тады нашы пекары спецыяліста, які ўмеў бы „пабяліць" сценкі катлоў. I знайшлі такога сярод цыганоў. I цікава, што ўсю работу па пакрыццю сярэдзіны катлоў тонкім пластом адпаведнага сплаву металаў выканаў ён толькі ў адсутнасць пастаронніх асоб. Так ён ахоўваў свой прафесіянальны сакрэт, які ў цыганоў перадаваўся з пакалення ў пакаленне. Пажылыя людзі ўспамінаюць, што калісь добрую патэльню можна было купіць толькі ў цыганоў.

Многіх людзей палоніць чароўнасць цыганскай музыкі. Вось сёлета, 2 верасня, на беларускім фэсце ў Орлі ў ліку мастацкіх выканаўцаў (бадай упершыню ў гісторыі мястэчка) перад вялікай аўдыторыяй выступіў калектыў „Цыганскія чары" Алены Руткоўскай. Музыка, спевы і танцы ў яго выкананні працягваліся каля гадзіны, якая публіцы праляцела маланкава і напэўна доўга астанецца ў памяці. Відаць гэта было па небывалым раней успрыманні гэтай праграмы арлянскай публікай не толькі ў час канцэрта, але і пасля яго. Варта заўважыць, што цыганскі калектыў свае песні — часам вельмі напорыста, часам вельмі лірычна — найбольш выконваў не на сваёй, ромскай, ці польскай мовах, толькі па-руску. I пасля канцэрта вялікая група публікі — ад малога да старога — не адступала ад мастакоў: ці каб супольна сфатаграфавацца з артыстамі, ці каб атрымаць аўтограф вакалісткі. Многія куплялі таксама кампакт-дыскі „Цыганскіх чараў"; некаторыя меламаны распытвалі пра іх яшчэ ў час канцэрта.

Гэтак было відаць, што цыганскія спевы, строі і танцы з'яўляюцца чымсьці незвычайным, што паланіць людзей. Найбольш, аднак, ззяла краса, усмешка і — перш за ўсё — цыганска-славянская душа вакалісткі калектыву Алены Руткоўскай. Папрасіў я ў яе даць кароткае інтэрв'ю нашым чытачам:

— ***Хто выступае ў Вашым калектыве і якія за Вамі поспехі?***

— Спяваюць і танцуюць дзяўчыны Аманта Сіндыя, Кінга Кармен і Караліна. Спяваюць і граюць на гітарах Ляоні і Элвіс Нат, які сёлета на агульнапольскім конкурсе ў Познані за выкананне песні Элвіса Прэслі атрымаў галоўную ўзнагароду і выйграў экскурсію ў Амерыку.

Калектыў выступіў па трэцяй праграме Польскага радыё і, пакуль, лічым мы гэта нашым найбольшым поспехам. Выпусцілі мы таксама тры фонаальбомы з цыганскімі рамансамі і баладамі.

— ***А фестывалі?***

— Выступалі мы на цыганскім фестывалі ў Гожаве-Велькапольскім, арганізаваным Эдвардам Дэмбіцкім. На фестывалі ў Цехацінку яшчэ не былі, але ўсё перад намі, — з прамяністай усмешкай адказвае спадарыня Алена.

— ***Калі ўзнік Ваш калектыў і дзе яго сядзіба?***

— Выступаем ад пяці гадоў, а жывём у трох гарадах: Варшаве, Любліне і Беластоку.

— ***Ну, а такое пастаяннае месца?***

— Пераважна ў Варшаве — вядзем вандроўнае жыццё.

— ***Вы хіба спяваеце змалку. Ці ўсе цыганы родзяцца з музычнымі здольнасцямі?***

— Думаю, што гэта так у сапраўднасці з маім спевам. Вядома, як у кожным народзе, ёсць людзі больш і менш расспяваныя і растанцаваныя. А я так думаю, што гэта цыганская душа спявае.

— ***А што такое асаблівае ў цыганскай музыцы, што яна так уздзейнічае на людзей?***

— Наша музыка вельмі рытмічная, з падаючым і растучым тэмпам. Гэта вельмі падахвочвае і прыцягвае да танца.

— ***Цыганскія ўборы вельмі прыгожыя, але хіба і вельмі дарагія?***

— Так. На адну цыганскую сукенку трэба аж трыццаць два метры матэрыялу. Да таго ж яшчэ мноства бліскавак, бранзалетак, дадаткаў...

— ***Запамятаеце хіба сваё выступленне ў Орлі?***

— Ой, так! Вельмі дзякую за небывала сардэчны прыём публікай нашага канцэрта. Запрашайце нас часцей, будзем прыязджаць.

„Класік-авангард" у Польшчы

19-20 кастрычніка 2007 года пры садзейнічанні Пасольства Беларусі ў Польшчы ансамбль салістаў Беларускай дзяржаўнай філармоніі „Класік-авангард" прыняў удзел у XXIV Днях Кароля Ліпінскага ў гарадах Радзынь-Падляшскі і Мендзыжэц-Падляшскі Люблінскага ваяводства. Канцэртныя выступленні праходзілі пад ганаровым патранатам пасла Беларусі.

У канцэртных праграмах ансамбля „Класік-авангард" прагучалі творы вядомых беларускіх і польскіх кампазітараў XVII-XIX стагоддзяў: М. Ельскага, С. Манюшкі, М. Радзівіла, М. К. Агінскага, Я. Казлоўскага, Н. Орды, Я. Голанда і іншых.

На канцэртах прысутнічалі кіраўнікі органаў мясцовага самакіравання Польшчы, пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка, прадстаўнікі Пасольства і Консульства Беларусі ў Белай-Падляшскай, прадстаўнікі рэгіянальных СМІ.

Публіка вельмі цёпла, з авацыямі ўспрыняла выступленні гэтага цікавага беларускага калектыву. Многія з прысутных адзначалі ўдзел ансамбля салістаў „Класік-авангард" у Днях Кароля Ліпінскага як значную падзею гэтага шматгадовага традыцыйнага фестывалю. Неабходна таксама адзначыць, што ансамбль „Класік-авангард" ужо тройчы паспяхова выступаў у 2007 годзе ў розных гарадах Польшчы.

Прэс-служба Пасольства РБ

Найпрыгажэйшыя сядзібы

17 кастрычніка г.г. падчас сесіі Рады Нараўчанскай гміны (Гайнаўскі павет) былі ўручаны грашовыя ўзнагароды і дыпломы пераможцам гміннага конкурсу „На найпрыгажэйшыя сялянскія сядзібы ў Нараўчанскай гміне".

У катэгорыі „сядзіба" два раўнапраўныя першыя месцы занялі Анна Ігнатовіч з Семяноўкі і Зіна Раманчук з Альхоўкі. Другое месца журы прызначыла Зофіі Валкавыцкай з Заблотчыны.

У катэгорыі „прыхатні кветкавы агародчык і падворак" узнагароду Гран-пры атрымала Крыстына Грэсюк з Новага Ляўкова. Першае месца заняла Лідзія Кардаш з Тарнаполя, другое — Галіна Вяжхоўская з Заблотчыны і трэцяе месца — Галіна Бірыцкая з Плянты. Віншуем!

(мох)

Небяспечная дарога

Небяспечна ехаць ваяводскай асфальтавай дарогай цераз Новае Ляўкова на адрэзку з Новага Ляўкова ў Плянту ў Нараўчанскай гміне. Зараз у асфальтавай маставой ёсць глыбокія выбоіны і яны адна каля другой. Найгорш ехаць веласіпедам або матацыклам — тут лёгка перакуліцца цераз руль або паляцець у адкос. Ноччу ўхабіны малапрыкметныя і на ровары лепш зусім не ехаць.

Вельмі пажаданым было б, каб Падляшскае праўленне ваяводскіх дарог у Беластоку паклапацілася пра рамонт вышэйзгаданага адрэзка шляху Юшкаў Груд — Бандары — Новае Ляўкова — Нараўка — Навасады. Тут вялікі рух — часта ездзяць самаходы, у тым ліку і цяжкія грузавікі.

(ян)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Што мы бачым

Фота Міры Лукшы

І клас гімназіі ў Чыжах з настаўніцай Галінай Скепка. Сядзіць Магда Анджэюк

У чыжоўскай гімназіі ў першым класе не ўсім калегам вядома хто з нас піша. Хто адважыцца паказаць свае творы ў школьнай газеце, то і прызнаны школьны аўтар. Напрыклад, Паўліна Башун. А тая газета — штоквартальнік. Як у кожным часопісе, публікуюцца ў ім рэпартажы, артыкулы, здымкі і іншыя творы. А як захапіць прыезджага Чыжамі? Вучні аглядаюцца, некаторыя спазіраюць на асенні каляровы школьны падворак у гэтай чыстай, акуратнай, нябеднай вёсцы. Андрэй з Ракавіч прапанаваў бы апісаць нейкія навіны. Даязджае ён у школу на аўтобусе ды найчасцей на ровары. Можна апісаць, што па дарозе цікавага ўбачыў. Выглядае ён на артыста, і сапраўды, увес клас разам з настаўніцай Галінай Скепка пацвярджае гэта. Адкуль вучні прыязджаюць у чыжоўскую школу? З Лядоў, з Крывое, з Арэхавіч, з Лукавіч, з Ляшчын!.. Чым можна пахваліцца? А вось у Крывой жыве вядомы народны мастак, ведаюць яго не толькі ў ваколіцы, але нават ва ўсёй Польшчы. Гэта Анатоль Краўчук...

Магда Анджэюк з Ляшчын ахвотна расказвае пра сваю маленькую вёсачку. Большасць хатаў там пакінутых, а і то адну спалілі летам, на канікулах, прыезджыя хлопцы. Чаго не забралі з гэтага пакінутага дома, дык згарэла, засталася адна печ. Магда набірае ахвоты расказаць пра сваю вёску. Пакуль нічога не пісала. Наконт таго пісання, што так вельмі цікавіць госця-журналіста, дык ніхто не хоча прызнацца. А ці ўвогуле піша моладзь? Так, ды гэта дзённікі, мемуары. Ці гэта не літаратура? Гэта ж не на тое, каб друкаваць? Ці ж будуць з іх літаратары? Ніхто з іх на літаратара не думае вучыцца. А доктар Юрка Геніюш? А доктар ветэрынарыі Францішак Кабрынчук? Можна пісаць, маючы іншую прафесію... А нататкі варта рабіць якраз пра тое, што прападае, што нікне. Вось пра гэтыя маленькія вёсачкі, з якіх даязджаюць вучні ў чыжоўскую школу. Распытаць старэйшых, запісаць іх расказы на магнітафоне, пашукаць цікавыя архіўныя здымкі...

— А мне бабця не дае глядзець старыя здымкі, — скамянулася Магда, якая набрала ахвоты распавесці пра сваю вёску і былое. — Таму што на іх многа суму. Ёсць там здымкі з пахаванняў, з вайны... Я расплакалася аднойчы, убачыўшы здымкі з пахавання. А мне аддала свой сшытак з вершамі адна жанчына з нашай вёскі. Яна іх больш ужо не піша. Пэўна, непатрэбныя ёй тыя вершы. Нарадзіла дзіця, мае іншыя справы.

Варта захоўваць хто як умее спадчыну — хай і словы «чужых бабуль», і сваіх, занатоўваць па каліўцы тое, што можа нам здаецца цяпер і малацікавым. Хай нават і малы слядок на родных сцежках захаваць, каб не сцёр яго час. А то зараз і нас неўзабаве вецер панясе па свеце. Трымаймася нашых карэньчыкаў!

Міра ЛУКША

ГІСТОРЫЯ ПРА САМЫ НАДЗЕЙНЫ СРОДАК АД БЯССОННЯ

Ах, Яначка, мілая Яначка! Ну чаму ты амаль з дня нараджэння ніколі ноччу ніяк не магла заснуць? Можа, таму, што табе ніхто не распавядаў добрых казак?! Ніхто не чытаў іх табе на ноч, ніхто не дарыў потым гэтых вялізных маляўнічых кніжак. А ты ўсё не спала ды не спала. І ніхто, ні адна жывая душа чамусьці так і не здагадалася, што ўся справа, магчыма, у казках...

Так і праляцелі твае бяссоныя пятнаццаць год. Так ляцелі б яны і далей, толькі аднаго разу, у летнім лагеры, калі ты проста ляжала ў ложку, ведаючы, што зноў не заснеш, раптам прысеў побач невядомы юнак, прыклаў палец да вуснаў і сказаў. Сказаў проста і ціха:

— Маўчы і слухай...

І ў той вечар, у той самы вечар ты пачула першую ў сваім жыцці казку. Казку, якую распавядалі толькі табе адной, адной табе асабіста. Юнака звалі Антосем, і з таго часу твой мілы Антосік стаў тваім самым надзейным, самым чуйным і самым добрым казачнікам. Штовечар, пакуль салодкая дрымота не закалыхвала цябе, ён сядзеў побач, расказваў табе чарговую чароўную казку, а ты, Яначка, засынала, засынала, засынала... А калі засынала — бачыла ў сваіх каляровых і незабыўных снах Антося. Усміхаючыся, ты бясконца гладзіла яго валасы, шчокі і рукі ды распавядала яму казку сваю. І тады салодка засынаў ён...

Ваш Дзядзечка Сід

6 кастрычніка 2007 г., Кобрын

Оля Мазурук з Беластока

ТУТЭЙШЫЯ ЗАМАЛЁЎКІ

Алеся

Калі яна вучылася ў маёй гімназіі, была найбольш вядомай дзяўчынай у школе. Алесю ведалі ўсе, таму што яна голасна і весела сябе паводзіла. Дзяўчына шакіравала адвагай. Яна магла падысці да зусім незнаёмага хлапца і з ходу пачаць з ім гутарку...

Нікому ў нашай школе не перашкаджала, калі Алеся на калідоры пачынала смяяцца і танчыць *пога*.

Год таму Алеся памяняла субкультуру. Раней яна была *растаманам*. Слухала рок-музыку, бегала ў глянах і доўгіх спадніцах у стылі хіпі. Цяпер яна прыналежыць з'яве, якую называюць *„дзяўчына дрэсаў"*. Алеся выкінула гляны і ходзіць у залатых туфліках.

Спачатку мы з Лёляй і Ганкай не разумелі гэтай метамарфозы сяброўкі. Але цяпер, пасля нейкага часу мы зноў прывыклі да яе новага выгляду.

Алеся ўмее напалохаць іншых. У час канікул, на летніку, мы былі вымушаны вяртацца ноччу праз лес. Калі на гадзіннику стукнула поўнач і мы найбольш баяліся, дзяўчына пачала апавядаць жахалкі.

— Аднойчы мае прабабка з парадзедам ехалі гэтай дарогай. А тут... жах! Праз дарогу прабег чорцік!

Мы вельмі напалохаліся чорцікам і на мяккіх нагах ледзь дабраліся ў базу...

Апрача туфлікаў Алеся памяняла падыход да хлопцаў і цяпер патрапіць вытрымаць з адным нават 8 месяцаў. Апошнім часам дзяўчыну мала хто пазнае, таму што яна пахудзела на 30 кілаграмаў і памяняла фрыз. Дзякуючы зменам, яна карыстаецца вельмі вялікім поспехам у хлопцаў. Відаць таму, калі яна са сваім хлопцам ідзе па вуліцы, ён моцна трымае яе за руку. Ён баіцца, што яму адаб'юць Алесю.

А можа і яго дзеўка напалохала чорцікам?!

Тэкст:truskawka9922@tlen.pl
Дызайн:lolcia05@tlen.pl

Музыка з кайфам

„Н.Р.М." — рэспубліка незалежных

Сёння пару слоў пра легенду! Пэўна не цяжка вам будзе прыгадаць пра каго і якраз чаму. Няпроста расказваць пра людзей ці гурты, якія яшчэ пры жыцці становяцца легендамі. Беларусь, аднак, гэта такая краіна, якая якраз патрабуе сістэматычнай, цяжкай працы ў бок зменаў і развіцця, а заадно патрабуе таксама герояў. Так складваецца, што герояў у нас шмат, перад усім на ніве культуры. Адным з найбольш вядомых і самых папулярных з'яўляецца гурт „Н.Р.М.".

„Незалежная Рэспубліка Мроя" магчыма не паўстала б, каб не дзейнасць яе старэйшай сястры — гурту „Мроя". Можна ў пэўным сэнсе сказаць, што „Н.Р.М." нарадзіўся ў 1980-х гадах, а прынамсі з'явілася важная ідэя. „Мроя" запісалася ў памяці фанатаў рок-музыкі перш за ўсё песняй „Зямля"... „Вось мая зямля пад нагой бяжыць..." — спяваў маладзенькім голасам Лявон Вольскі, які тады яшчэ, мабыць, і не думаў, што ў будучыні паклоннікамі яго творчасці стануць пэўна тысячы і маладых, і ўжо старэйшых слухачоў. Натуральнай паслядоўнасцю „Мроі" стаў тады „Н.Р.М.". 1994 год прынёс зорку і легенду, перад усім маладым, бо хаця тэксты песень сур'ёзныя, метафарычныя, то дзякуючы музыцы і цікаваму спалучэнню гэтых двух вымярэнняў песні столькі моладзі ездзіць на канцэрты і спявае разам „Гэй, ля ля ля ляй, ты не чакай, сюрпрызаў ня будзе" ці „Падымі мяне па-над зямлёю, падымі мяне ў светлы абшар". Слова „зямля" вельмі часта паяўляецца ў іхніх тэкстах, бо вось якраз яна ідэйна іх спалучае. Бацькаўшчына ці для іншых проста радзіма і яе сімвалы аб'ядноўваюць іх у „Незалежнай Рэспубліцы Мроя". А каго канкрэтна аб'яднала ў час яе нарадзінаў? Ідэйным лідэрам і хіба найбольш вядомым рокменам стаў Лявон Вольскі, вакаліст і гітарыст. На сольнай гітары зайграў Піт Паўлаў, які таксама стварыў многа іншых музычных праектаў. На бас-гітары прэзентуецца Юрась Ляўкоў, а на бубнах іграе Алезіс — Алег Дземідовіч. Варта сказаць, што ўсе дапамагаюць спевам. За імі шмат гадоў працы, перад усім вельмі плённай. Мала сказаць, што ў іх дыскаграфіі знойдзем сем альбомаў (у тым ліку і запіс акустычных канцэртаў), бо яны актыўна працавалі пры ўсіх супольных праектах — такіх як „Народны альбом", „Я нарадзіўся тут" ці „Скрыпка дрыгвы". Песні „Н.Р.М." можна знайсці на гэтак званых трыб'ютах „Песнярок" ды „Personal Depeche", затое іхнія песні сябры і маладыя гурты зайгралі на супольнай кружэлцы „Віза «Н.Р.М.»".

Столькі гадоў працы — гэта і радасці, і турботы. Не адзін казаў, што гісторыя гурту „Н.Р.М." спыняецца, а яны нібыта насуперак усяму выдаюць чарговыя альбомы. А на іх знаходзяцца гіты, напрыклад, „Менск і Мінск", які стаў песняй года сярод інтэрнэт-слухачоў.

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

Доўгавалосы

Доўгавалосы на сустрэчы
Пытае сябра Валодзю:
— Ці твае бацькі не пярэчаць
Што ты са мною ходзіш?

— У хаце ніколі не паўтараю,
Што хуліганіш ты няспынна.
Мае быцькі засцярог не маюць,
Яны думаюць, што ты дзяўчына.

Мудрэц і дурань

Не любіш ты хадзіць у школу,
Вучыцца там, як след.
Усіх пераконваеш наўкола,
Што быццам ты ўсявед.

Вядома, нельга з тым мірыцца,
І гэтае ўспрымаць.
Любіць мудрэц заўжды вучыцца,
А дурань — павучаць.

Польска-беларуская крыжаванка № 44



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 40: Крот, каліна, порт, акно, хмарка, вал, мармур, кара, жыта, гара, зыск, купэ, салон, ельнік. Кут, хмыз, матыль, парасон, корм, аркуш, алтар, густ, на, капа, акварэль, нара, школа, Аня.

Узнагароду, **фільм на DVD „Урок беларускай мовы" (аўтар Міраслаў Дэмбінскі)**, выйгралі: **Магда Сахарчук, Юліта Панютыч, Габрыель Ярацэвіч** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Беларуская асвета ў Еўрасаюзе

Ганна КАНДРАЦЮК

Лявон Луцкевіч, нашчадак беларускіх адраджэнцаў, аўтар славутых „Вандровак па Вільні” прадбачыў цяжкасці беларусаў у незалежнай Літве. Спрацаваў на іх сам час. Пасля 1945 года, пры савецкай уладзе, у Вільні былі спынены якія-колечы праявы беларускага грамадскага жыцця, забаронены згуртаванні, школы, перыядычны друк. Наступілі дзесяцігоддзі летаргічнага сну. Толькі ў канцы васьмідзесятых гадоў узніклі першыя парасткі аднаўлення беларускай традыцыі Вільні і Віленшчыны.

У адрозненні ад нас, беларусы Літвы ў вялікай ступені ментальна і матэрыяльна ўзалежнены ад Рэспублікі Беларусь. Спачатку дапамога з боку Мінска мацавала і абнадзейвала. Сітуацыя змянілася пасля 1994 года, калі да ўлады прыйшоў Аляксандр Лукашэнка. З таго часу кожная дапамога мае неадназначны характар і, напэўна, не спрыяе адраджэнню беларускага духу.

Клопаты беларусаў, быццам у люстры, бачны на прыкладзе беларускай школы імя Францішка Скарыны ў Вільні.

Хведар Нюнька, старшыня Таварыства беларускай культуры ў Літве, які меў непасрэднае дачыненне да стварэння школы, не скрывае свайго расчаравання:

— Калі мы (між іншым з Лявонам Луцкевічам — Г.К.) заснаўвалі гімназію, успрымалі яе як працяг той даваеннай беларускай гімназіі, якая была кузняй нацыянальнай свядомасці. На жаль, сённяшняя сярэдняя школа гэта не той напрамак, пра які мы думалі, калі яе заснаўвалі. Сёння яна знаходзіцца пад уплывам беларускай амбасады, значыць, існуючага рэжыму ў Беларусі. Кантакты ў нас парваліся...

На адкрыццё мемарыяльных табліц у гонар Максіма Гарэцкага і Наталлі Арсенневай не прыйшоў ніхто з вучняў беларускай школы. Цяжка ўявіць большую праяву ігнаранцыі, тым больш што ўрачыстасць праходзіла ў Дзень настаўніка. Справа ў тым, што Арсеневу зноў выкраслілі з праграмы навучання ў Беларусі.

* * *

У Літву і Латвію падалася я з мэтай высветліць праблемы беларускага школьніцтва. Ад нейкага часу даходзяць да нас хвалюючыя весткі, у тым ліку пра пагрозу канчатковага знікнення беларускіх школ. Хацелася пагутарыць наконт супольных праектаў для школьнікаў і моладзі. Урэшце, параўнаць іхныя і нашы праграмы навучання па беларускай мове і гісторыі. Наш досвед у Еўрасаюзе, хоць пад татальным прэсінгам асіміляцыі ў польскі бок, усё ж жыццяздольны. Беларуская меншасць у Польшчы трымаецца на ўласных сілах. Хоць няма ў нас ні адной беларускай школы, лік школьнікаў, якія вывучаюць беларускую мову на прынцыпе добраахвотнасці, утрымоўваецца на адным узроўні. Станоўчую ролю адыгрываюць тут пазаўрочныя беларускія і рэгіянальныя гурткі ды маладзёжныя арганізацыі, якія далучаюць беларускі рух да кантэксту сучасных культурных плыняў. І назіраецца агульная пазітыўная змена — пра беларускасць пачынаюць гаварыць як пра атракцыён рэгіёна. Беларускія кухня, прырода, калектывы, архітэктура — усё часцей бачацца як вабны тавар для замежных турыстаў. На апошняй справе зарабляюць і самі беларусы, якія ўсё часцей і часцей бяруцца за агратурызм...

Наогул не ўяўляем, які вялікі капітал можам выпрацаваць разам з суродзічамі з Літвы, Латвіі і Эстоніі. Першая адукацыйная задача, якая дапаможа Беларусі адкрыцца на Еўропу гэта вяртанне Вялікага княства Літоўскага ў кантэкст беларускай свядомасці. Менавіта на гэтай базе варта арганізаваць супольныя мерапрыемствы. Варта супольнымі сіламі весці старанні, каб адкрыць факультэт старабеларускай мовы, напрыклад, у Рыжскім універсітэце. Жыхары Падляшша, якія захавалі *сваю мову* (наш дыялект з-пад Бельска), на аснове якога ўзнікла старабеларуская мова, як ніхто іншы могуць тут спрычыніцца да адраджэння старой традыцыі. Яе маргінальная прысутнасць у праграмах навучання мае свой адмоўны вынік найперш у нізкай цывілізацыйна-нацыянальнай свядомасці беларусаў. Наш досвед можа быць карысным і сучаснай Літве. Як вядома, на нашай *свойскай* мове вяліся іх дзяржаўныя дакументы і справаздачы, хронікі і пераклады сусветнай літаратуры ў першым стагоддзі існавання ВКЛ. Наша мова выконвала тады прыблізна такую ролю як латынь у Польшчы. Ці нехта з палякаў можа ўявіць сабе непатрэбнасць латыні ў вывучэнні гістарычнай спадчыны? У Літве пакуль не з'явілася такая ініцыятыва, але пытанне ўзнікне ў недалёкай будучыні.

* * *

Спачатку хвалявала мяне атмасфера, якая цягам апошніх гадоў стварылася вакол Віленскай беларускай школы імя Францішка Скарыны. Ужо ў Беластоку сябры мяне пачаставалі пытаннем ці сапраўды пайду ў тую школу. Быццам у маім жаданні пераступіць яе парог была нейкая непрыстойнасць... Факт, цягам апошніх гадоў аб школе распаўсюджваюцца адны непрыемныя весткі, напрыклад, пра экскурсіі ў палац Аляксандра Лукашэнкі, якія дырэкцыя школы ладзіць сваім вучням у якасці навагодніх падарункаў. Прытым паездкі ладзяцца за кошт дзяцей...

З боку віленскіх беларусаў прыйшлося пачуць яшчэ больш крытычныя словы. Асабліва з боку бацькоў, якія выпісалі адтуль сваіх дзяцей. У першую чаргу наракалі яны на русіфікацыю і маразм, на мізэрную матэрыяльную базу... Тут таксама з неахвотай успрынялі маё жаданне асабіста наведаць школу і пагутарыць з дырэкцыяй ды настаўнікамі.

Неахвота і абыякавасць сустрэлі мяне і ў самой школе.

Галіна Сілава, кіраўніца школы таксама не знайшла вольнай хвіліны, каб сустрэцца з нашай рэдакцыяй ды расказаць пра свае радасці і турботы. Калі я з'явілася ў дамоўлены час, мяне паінфармавалі, што сустрэча не атрымаецца:

— Спадарыня дырэктар, — патлумачылі настаўнікі, — падалася на нейкія важныя курсы...

Сам візіт у школу зрабіў усё ж станоўчае ўражанне. Тое, што я пабачыла ў Вільні, нагадвала мне надта знаёмую карціну — гэта была Беларусь у мініяцюры! Даволі сімпатычна выглядала сустрэча з моладдзю, настаўніцамі ды ахоўнікам будынка. Сам Хведар Нюнька, хоць не шкадаваў у адрас установы крытыкі, канчаткова сцвердзіў:

— Гэта адзіная беларуская школа ў Літве, дзе большасць прадметаў вядзецца на беларускай мове...

* * *

Вільня для беларусаў значыць прыблізна тое самае, што Кракаў у гісторыі палякаў. Цягам стагоддзяў гэты славянска-балцкі цэнтр заряджаў пазітыўнай энергіяй і новымі ідэямі беларускія (у тым ліку Падляшша), польскія ды літоўскія землі. Месца, у якім былі адкрыты табліцы ў гонар Максіма Гарэцкага і Наталлі Арсенневай ведае кожны паляк. Найперш дзякуючы Адаму Міцкевічу і апісанай ім *камеры Конрада* ў III частцы „Дзядоў”. Славутая камера знаходзілася ў Базыльянскіх мурах, дзе ў 1919-1944 гадах працавала беларуская гімназія, дзейнічаў беларускі музей старажытнасцей і тэатральная майстэрня Францішка Аляхновіча. Хведар Нюнька назваў Базыльянскія муры святым куточкам для кожнага беларуса. Якраз у гэтым месцы прынялі пакутніцкую смерць тры віленскія мучанікі: Антоній, Іаан, Яўстафій. (Зараз іх мошчы знаходзяцца на процілеглым баку вуліцы ў Святадухаўскім саборы). На пазначаных часам мурах Свята-Троіцкай царквы, узведзенай Канстанцінам Астрожскім пасля перамогі Масквы ў 1514 годзе пад Оршай, захавалася старая фрэска. У акне-нішы сустрэнем выяву трох мучанікаў. Паводле легенды, фрэска сама аднавілася. У царкве знаходзілася цудадзейная Ікона Праведнай Божай Маці, якую меў напісаць сам апостал Лука...

У Вільні пачалася наша гісторыя пісьменнасці. Ужо ў 1522 годзе Францішак Скарына надрукаваў (першую тут на славянскай мове) „Малую падарожную кніжыцу”. Тут, за кошт Льва Сапегі, пабачыў свет III выпуск Статута Вялікага княства Літоўскага (1588), тут з'явіліся першыя газеты на беларускай мове — „Наша Доля” і „Наша Ніва” (1906). У гэтым жа годзе былі заснаваны Алаізай Пашкевіч пяць беларускіх пачатковых школ і курсы для настаўнікаў. Пасля, як мы ўжо згадалі, цягам 25 год існавала Віленская беларуская гімназія. Гісторыкі і віленскія беларусы ўстанову згодна называюць кузняй беларускіх элітаў. Пад уплывам Вільні сфармаваліся як беларускі рух на Беласточчыне, так і беларускае школьніцтва. Прытым вялікую ролю ў развіцці цэнтра адыгрывалі таксама выхадцы з Беласточчыны. Праўда, віленска-беластоцкая старонка пакуль у нас малавядомая. Варта разважыць наш новы геапалітычны шанц ды ўпісаць віленскую спадчыну ў нашы школьныя праграмы навучання і ладзіць нашым гімназістам, ліцэістам і студэнтам літаратурна-мастацкія экскурсіі па беларускіх сцежках Вільні.

(працяг будзе)

фота Ганны КАНДРАЦЮК

Віленскія беларусы побач даваеннай беларускай гімназіі

фота Ганны КАНДРАЦЮК

Вострая Брама — сімвал Вільні

Лук'янюкова хата не з краю

Міра ЛУКША

У Бялкі заязджаем яшчэ да прыцемкаў. Ад Трасцяніцкага гасцінца вядуць нас падсветленыя фіялетава-ружовым захадам хмары — ідзе на кастрычніцкія замаразкі. На палетках зазімачная цішыня. Калісьці стараліся дакапаць бульбу да Пакровы. Цяпер на палетках ні чалавека, ні мяшка, ні бульбы — хто яшчэ земляроб, управіцца з уборкай плёну — памаглі яму раз-два машыны. На касмічна выглядаючых палетках толькі беляхцяць параскідваныя быццам іншасветныя аграмадныя кулі. Ды самі вёскі як вёскі — хоць аціхлыя, асабліва ўвосень і зіму, людзям жывецца ў іх. Мусіць неяк жыцца. А як жывецца, дык можна папытацца або прачытаць.

Хоць бы ў вершах Міколы Лук'янюка, да якога мы едзем у неспадзяваныя госці. Ягоная хата з краю вёскі, за ёю, за Бялкамі; на ягоным з цёткай Сафіяй падворку стаіць канцавы крыж. Ды ягоная „хата не з краю"! Усім хвалюецца, што ў наваколлі дзеецца, ды і не толькі тым, што за плотам, у гміне ці нават краіне. І возьме ды напіша. І яму друкуюць. У „Ніве" ўжо больш за паўстагоддзя бачны ягоныя допісы і вершы. Вершы сатырычныя, лірычныя, публіцыстычныя...

— А, такія там вершыкі! Брыдкія! Такі там пісацель! — пасміхаецца цётка Сонька, несучы на стол пірог. Знянацкія госці заспелі аўтара і яго музу вечарком, дык і можа гэтак і лепш. Ці чарку возьмеш? — гэта з нагоды першай кнігі Міколы Лук'янюка, зборнічка „З нарваўскага боку", што якраз выйшла з друку. Абы хапіла рэшты на пончыкі! Каву на бяссонную ноч выпіць трэба. Бо ёсць пра што думаць і пісаць.

А даўно Мікола вершы піша? Даўно. — А яна ведае? — смяецца гаспадар. — Ведае. Сонька памятае першы верш з першага класа, які тады Мікола напісаў. Бо вучыліся яны разам, у адным класе. Зося з аднаго боку вёскі, Коля з другога. Разам пачыналі, хоць Коля пайшоў у школу ў 11 гадоў, бо ж вайна была (нядаўна той вершык Мікола запісаў сваёй унучцы ў Міхалове, на ёлачку, па-руску). Школу канчалі ўжо будучы ў сужонстве, Сонька сёмы клас канчала, быўшы ўжо маці чатырох дзяцей. Вершаў пра каханне Мікола не пісаў? Не. Несур'ёзныя вершыкі, от, гульня словам? Цётка Сонька і не спадзявалася, што з вершаў, дзесяткаў, нават соцень вершыкаў хтосьці схоча скласці кніжачку яе „хатняму паэту".

— От, ходзіць-ходзіць, сядзе тутака, на кухні за сталом, і піша...

Дзядзька Мікола мае свежыя вершы. Адзін той жартаўлівы, пра баль у гміне. Праўдзівы. Бо няма што лгаць, праўду варта пісаць. Пра тое, як жывецца ў Бялках і іншых вёсках Нарваўскай гміны і ўсяе Беласточчыны, пра ўладу ўдалую і неўдалотаў, што толькі пнуцца да кіравання, а папсаваць толькі ўмеюць ды і нават тое што добрае. Калі пахваліць варта, дык і пахваліць можна — працавітых земляробаў, майстроў, талковых прадпрымальнікаў, якія працу дадуць іншым і працуюць для дабра ўсяе Беласточчыны. Каментарый грамадскага жыцця ад земляроба, ужо пенсіянера.

Усё бачу што дзеецца, не толькі ў гміне

У Бялках людзі жывуць. Брат і браціха Соньчына, Міколава сястра. Людзі немаладыя. Дзядулі і бабулі. Хварэюць. У гміну, да лекара, цяжка дабрацца — ліквідавалі аўтобусы. А калі і напісана на раскладзе — дык і так едзе раз, два разы ў тыдзень. І то добра. Як жывецца-дажываецца пенсіянеру ў запаведніку Усходняй сцяны? Так і пішацца Міколу Лук'янюку: *паданні* да ўладаў, каб услухоўваліся ў тое, чаго жадаюць іх выбаршчыкі, *парады для ўлады*, каб ведала пра тое, нашто яе выбралі і для чаго яна пастаўлена. Кожнаму прычапіў латку, па імі-прозвішчы, хай то будзе гмінны ўладар, ці нават і прэзідэнт усяе краіны. А каго пахваліць варта, дык трэба. Можна сказаць, што голас дзядзькі Міколы — голас народа. І некаторыя вершы ведаюць людзі на памяць.



Зборнік вершаў, выдадзены Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва"

— Ці паэзія памагае ў чымсьці? — пытаюся ў пані Сафіі.

— Памагае! — гаспадар упэўнены. — Можа, найбольш мне самому. Прыйдзе нешта ў галаву...

— Не, не памагае. Што яна яму памагае? Адно толькі, што прыйдзе яму ў галаву што, і піша. Можа, лягчэй? — задумваецца гаспадыня. — Час каратае. Які верш — сапраўдны верш, часам адно нейкія жарты. Адно што па-беларуску мала хто чытае. Яшчэ нашы дзеці дык умеюць чытаць.

„У дзеда карова отэлілася, рабое тэля прывэла", — расказвала на гданьскім падворку ўнучка Лук'янюкоў, Уля, вярнуўшыся з Бялкоў дахаты. Мусілі ў кватэры яе патрымаць, каб забылася „вясковую мову".

Два каты, два пеўні, дваццаць курак — цяпер уся гаспадарка Лук'янюкоў. Нават хата на сына перапісана. Гаспадаркі было больш за дзесяць гектараў. Не забыўся Мікола, майстар на ўсе рукі, як касіць. Ды што за год — дажджоў многа, грыбоў мала. Хату Лук'янюкоў ведаюць у ваколіцы — тут здаўна скупка грыбоў. Везлі грыбы і з Гознай, і з Патокі, і з Сакоў, Гароднік, Пухлоў, Малынкі... Цяпер скрозь прымаюць, у кожнай вёсцы. А найбольш грыбоў у іх сваіх — пад дубамі на падворку. Чатыры дубы, адзін зрэзалі. Дзед Купрыян іх садзіў. І пра яго ў „Ніве" было. „Ніва" — такая хроніка тутэйшая. І вершы Міколы Лук'янюка, хай пра важныя, хай пра менш сур'ёзныя справы — лісток у гэтай тутэйшай хроніцы.

Гэта галава нашай сям'і, але я ўвесь час шыяй — смяецца спадарыня Сафія

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Пагулянка

І журботы, і хваляванне.
Будзе ў гміне баляванне.
Войт бяседу закладае,
Маладых сялян склікае.
На сталах ёсць самагонка,
Закусіці ёсць „пальцоўка",
Хлебным квасам запіваюць,
П'юць, спяваюць ды гуляюць.
А жанчыны, праз хвіліну,
Рэжуць кумпяк, кішку, саланіну,
Свойскі хлебец нашай Манькі, —
Будзе весела гулянка!
Балявалі аж да рання,
Самога світання,
А потым па чарцы —
У свае гаспадаркі.
Калі свіней накармілі,
Кароў падаілі,
На канапы палягалі,
Моцным сном паспалі.
А малако іх свежа-бела
Ва ўмяшчальніках зашумела,
А такое ў малачарню
Везці ўжо марна.
Кажа злосна Манька Івану:
— Малака ў нас поўны ванны!
Тварагу хоць адбаўляй!
Куды хочаш — падзявай!
Раздалі яны тварог,
У вёсцы бралі ўсе хто мог.
Нават войту Іван павёз
Тваражку цалюткі воз.
Радасць пенсіянерам —
Наеліся яны сырам.
Дзякавалі Мані з Іванам
За частунак непадманны.
Ды ад гэтага банкету
У сям'і ўсё не гэта:
Не гаворыць Манька
З сваім мужам Іванкам!
Я не меў на чым дабрацца,
Каб у гміне больш дазнацца;
Усё пачуў я ў Беластоку.
Ад смеху мне балелі бокі!

Аматар

Паелі куры ўжо авёс,
Пачалі дзяўбці пшаніцу,
Па сядзібе дзедка ходзіць
У доўгіх нагавіцах.

Прыглядаецца курам,
Як яны сакочуць,
Певень бегае кругом:
Даць яйка ім хоча.

Дзедка тут павесялеў
І пайшоў дахаты,
Стаў ён бабку абымаць,
Шчыра цалаваці.

— Ой, мая любая бабка,
Я там надзівіўся,
Як певень курэй ганяў,
І я расхадзіўся.

Хадзі, пойдзем на канапу,
Я цябе чакаю,
Тады мы памаладзеем,
Будзем жыць як у раю.

Бабка дзеду адказала:
— Адурэў, старэча!
Ідзі, ляж на запечак,
Пагрэй свае плечы.

Што ж было рабіці дзеду!
На ляжайку звалійся,
А як крышку задрамаў,
Пра бабку забыўся.

Гродзенскі паэт — Юрка Голуб

Сяргей ЧЫГРЫН



Калі з друку ў 1969 годзе выйшаў першы паэтычны зборнік вершаў Юркі Голуба „Гром на зялёнае голле", Аляксей Пысін напісаў на яго рэцэнзію, апублікаваў у „Магілёўскай праўдзе" і назваў „Узыходжанне". Хаця ніякага дачынення малады паэт з вёскі Горна Зэльвенскага раёна да Магілёўшчыны не меў, але дужа спадабаліся вершы вопытнаму літаратару. Станоўчыя рэцэнзіі на першую кніжку Юркі Голуба з'явіліся ў „Гомельскай праўдзе", у „Маладосці", „Нёмане", „Полымі" і іншых выданнях. Вось бы сёння так пісалі пра паэтычныя зборнікі беларускіх паэтаў, тады пра іх ведала б уся Беларусь і цаніла б паэтычны талент пасапраўднаму шчыра і дастойна.

Аляксей Пысін у той час не памыліўся, бо ён адразу адчуваў і бачыў таленавітых хлопцаў і прарочыў ім паэтычную славу. Узыходжанне па паэтычны Алімп ён прадказаў і Юрку Голубу. З цягам часу з друку пачалі выходзіць новыя кнігі вершаў паэта — „Дрэва навальніцы", „Векапомнае поле", „Помню пра цябе", „Сын небасхілу", „Поруч з дажджом", „Багра" і іншыя.

Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта Юрка Голуб не застаўся ў сталіцы, як многія яго сябры і равеснікі, а паехаў на родную Гродзеншчыну. На абласным радыё ён вёў цудоўную перадачу „Гродзеншчына літаратурная", а пасля ў „Гродзенскай праўдзе" загадваў аддзелам культуры і штомесяц рыхтаваў і друкаваў літаратурныя старонкі, дзе змяшчаў творы пісьменнікаў Гродзеншчыны, а таксама гісторыка-краязнаўчыя старонкі „Родны край". Гэта мы, маладзейшыя творцы Гродзенскай зямлі, абавязаны яму за тое, што пра нас ён пісаў, апрацоўваў і друкаваў нашы першыя вершы, замалёўкі, нарысы.

У 2002 годзе Юрка Голуб разам з рэдактарам „Гродзенскай праўды" Іосіфам Багінам пачаў выдаваць літаратурны штогоднік „Галасы". Там публікаваліся вершы і апавяданні, а таксама краязнаўчыя артыкулы аўтараў з гарадоў і вёсак Прынёманя. Распачата была добрая справа, каб падтрымаць творчую інтэлігенцыю, сабраць лепшае, што было напісана за год і апублікавана на старонках „Гродзенскай праўды". Выйшлі з друку „Галасы" 2002, 2003, 2004, 2005 гадоў. А вось „Галасы-2006", хоць і былі складзены, так свету і не пабачылі. На пасаду рэдактара абласной газеты ў мінулым годзе прыйшла нехта Бераснева, і яна забараніла выдаваць літаратурныя старонкі і старонку „Родны край", а таксама знішчыла і „Галасы". Не вытрымаў і Юрка Голуб, сышоў з „Гродзенскай праўды". Неяк пры сустрэчы я запытаўся ў яго пра справы ў газеце. Ён адмахнуўся: „Лепш, Сярожа, не пытайся..."

Але не сышоў Юрка Голуб і яшчэ доўга не сыдзе, не збочыць са сцяжынкі Паэзіі. Хоць, як сцвярджае Міхась Скобла, паэт да гэтай пары застаецца на належным узроўні не ацэнены крытыкай. Магчыма. Але якія ў яго паэтычных радках моцныя вобразы, параўнанні, інтанацыі, што калі іх чытаеш — проста смакуеш:

Зноў плешчацца ў плюшчы.
Трашчыць —
Чутно пад ранкі —
У ліўня на плашчы
Сухое шво маланкі.

Літаратура — не рэспубліка роўных. Гэта, здаецца, сказаў некалі Бальзак. Літаратура аб'ядноўвае вакол сябе таленты рознай велічыні і рознага гатунку. Талент Юркі Голуба вызначаецца яго непаўторнай манерай пісьма і вельмі вялікай асацыятыўнасцю. Яго паэтычны почырк не падобны да почырку іншых паэтаў. Яго нельга зблытаць з іншымі, ён — свой, са сваім адметным голубаўскім мысленнем і арыгінальнасцю. Ён па-сапраўднаму таленавіты чалавек, вельмі сціплы ў жыцці і вельмі шчыры. Пра родную Зэльву і Зэльвеншчыну ён некалі напісаў: „Калі дзень разгортвае на небакраі ручнік раніцы, я дыхаю табой. Калі поўдзень садзіцца на золата саломы і палуднуе, я спраўляю на смак твой хлеб. Калі над горненскім лесам нясмелай сініцай цінькае першая зорка, я ўслухоўваюся ў цябе. Радуюся...". Хораша сказана, ці не праўда...

20 кастрычніка сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў паэт Юрка Голуб адзначыў сваё 60-годдзе. Божа мой, зусім нядаўна, здаецца, калі я ў 1980-х гадах быў студэнтам БДУ, выкладчыца французскай мовы Святлана Мікалаеўна Любіч на ўроках вельмі часта згадвала свайго любімага выпускніка і майго земляка Юрку Голуба. „Мой Юрачка!.." — казала яна. Больш ніяк, толькі так яго называла. На вялікі жаль, наша любая Святлана Мікалаеўна рана пакінула гэты свет. Ды і яе Юрачку ўжо 60. А для нас, маладзейшых за юбіляра, ён — Юрый Уладзіміравіч. З юбілеем Вас! Няхай Ваша паэтычнае ўзыходжанне, Юрый Уладзіміравіч, яшчэ працягваецца доўга-доўга, аж да новых юбілеяў і кніг.

http://dzida.org

Пра Малады фронт — маладзёжную арганізацыю нацыянальна-дэмакратычнай накіраванасці — „Ніва" ўжо пісала. Зыходзячы з таго, што даная арганізацыя па-ранейшаму не прызнаецца лукашэнкаўскай уладай і незарэгістраваная ў адпаведнасці з беларускім заканадаўствам, але працягвае сваё, без перабольшвання, годнае існаванне, варта зноў распавесці аб яе дзейнасці. Праўда, не ў рамках цэлай Беларусі, а адной з яе суполак — гродзенскай, бо Гродна з'яўляецца бліжэйшым да Беласточчыны буйным горадам па-за „ўсходняй сцяной" з практычна адзінай гісторыяй.

Каб віртуальна завітаць да гродзенскіх маладафронтаўцаў, на сваім камп'ютэры трэба набраць адрас сайта http://dzida.org. Чаму сайт называецца менавіта „Дзіда", нідзе не тлумачыцца. Выгляд жа першай старонкі партала даволі прывабны. Наверсе галоўнай старонкі месцяцца выяўленні дзіды, галавы аленя, які выступае элементам гродзенскага герба, а таксама банэр акцыі за захаванне старога Гродна.

Далей старонка падзелена на тры традыцыйныя часткі. Але ў адрозненні ад традыцыі, выйсці да рубрык знаходзяцца з правага, а не з левага боку. З левага ж гродзенскія маладафронтаўцы пішуць пра галоўнае. А галоўным на даны момант для іх з'яўляецца збор беларускамоўных кніг для дзіцячых дамоў вобласці. „Калі дзяржава ня можа на належным узроўні займацца адукацыяй і выхаваньнем новага пакаленьня беларускае моладзі, мы мусім усімі магчымымі шляхамі спрыяць выхаваньню дзяцей, паводле нацыянальных каштоўнасьцяў і хрысьціянскіх прынцыпаў! — катэгарычна сцвярджаюць маладыя гродзенскія патрыёты. — Сёньня мы распачынаем збор беларускамоўных кніжак для дзіцячых дамоў і школаў інтэрнатаў. Мы лічым гэта своечасовым і неабходным крокам, які дасьць магчымасьць беларускім дзецям з маленства чытаць творы на роднай мове, расьці сапраўднымі і шчырымі беларусамі".

Пасярэдзіне галоўнай старонкі месцяцца навіны, якія абнаўляюцца даволі аператыўна, што з'яўляецца неблагім сведчаннем дбайнага стаўлення да свайго віртуальнага прадстаўніцтва з боку распрацоўшчыкаў і натхняльнікаў сайта.

Калі „прашпацыраваць" па рубрыках, то найбольш цікавымі падаюцца старонкі „Артыкулы" і „Гісторыя". У першай размешчаны разнастайныя расповеды і разважанні аб сучасных падзеях, звязаных як з горадам, так і з Беларуссю, а ў другой месціцца вельмі падрабязная інфармацыя пра гісторыю Гродна ад пачатку другога тысячагоддзя. Гістарычны расповед заканчваецца 1991 годам, ад якога, трэба разумець, пачынаецца гродзенская сучаснасць.

Старонка „Галерэя" таксама заслугоўвае асобнай увагі, бо тут змешчаны фотаздымкі, якія тычацца розных падзей, удзел у якіх прымалі маладафронтаўцы. Больш падрабязна аб некаторых з акцый мы можам даведацца ў рубрыцы „Дзейнасць". Праўда, там пакуль распавядаецца толькі пра дзве кампаніі, якія, пэўна, былі сарганізаваны Маладым фронтам — гэта „Горад — наш!", калі на будынках шэрагу буйных беларускіх гарадоў залуналі бел-чырвона-белыя палотнішчы, і „Беларусь — у Еўропу!", якую цягам некалькіх гадоў праводзіць Малады фронт і, верагодна, лагічным, хоць, можа і неадмысловым, звяном у ланцужку данай кампаніі стаў апошні „Еўрапейскі марш".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ



Гродна забрала кубкі

Пасля сенсацыйнага бронзавага поспеху жаночай баскетбольнай зборнай Беларусі інтарэс у краіне да гэтага віду спорту крыху ажывіўся. У цэнтры ўвагі, канешне, дзяўчаты Анатоля Буяльскага, якія зараз раз'ехаліся па сваіх камандах у розныя краіны. Галоўнае, што дружыну чакае алімпійская кваліфікацыя, якая пройдзе ў чэрвені наступнага года. На запаветныя 5 пуцёвак будуць прэтэндаваць 12 краін: ад Еўропы — Іспанія, Беларусь, Латвія і Чэхія, ад Паўднёвай Амерыкі — Бразілія і Аргенціна, ад Паўночнай Амерыкі — Куба, ад Азіі — Тайвань і Японія, ад Афрыкі — Сенегал і Ангола і, нарэшце, ад Акіяніі — экзатычныя Фіджы. Месца гэтага турніру пакуль не вызначана, на яго правядзенне прэтэндуе і Беларусь.

Між тым нацыянальны баскетбольны сезон стартаваў з розыгрышу кубкаў краіны. І ў мужчын, і ў жанчын галоўным прызам авалодалі гродзенскія каманды. „Алімпія", саступіўшы сваім галоўным канкурэнтам — барысаўскай „Беразіне" і „Мінску-2006" на старце Балтыйскай лігі, не стала адкладваць рэванш у далёкую скрыню. У аднакругавой пульцы на сваёй пляцоўцы выхаванкі Аляксандра Шымкавяка перамаглі ўсіх саперніц і ўпэўнена чарговы раз прыватызавалі трафей.

Куды больш упартай выдалася змаганне за кубак у мужчын. Спярша клубы, падзяліўшыся на два квартэты, выявілі паўфіналістаў. На подступе да фіналу чэмпіён краіны мінскі „Віталюр" без праблем адолеў гомельскі „Сож", а „Гродна-93" з напругай узяло верх над асіповіцкім АЗАА. У вырашальным матчы перавага заходнікаў вызначылася толькі двума пунктамі — перамогшы з лікам 81:79, гродзенскія баскетбалісты пасля двухгадовага перапынку вярнулі кубак на берагі Нёмана. Гэта першы поспех „Гродна-93" пад кіраўніцтвам маладога і сімпатычнага трэнерскага тандэма — Юрый Чарняк і Андрэй Васілеўка, перш чым ступіць на трэнерскую сцежку, доўгія гады баранілі колеры роднай каманды.

Тым цікавейшым будзе новы чэмпіянат краіны. Фаварыцтва сталічнага „Віталюра", якім зноў верхаводзіць дасведчаны Міхаіл Фейман, не выглядае ўжо такім бясспрэчным. Каманду пакінуў шэраг кваліфікаваных майстроў — спецыяліст па далёкіх кідках Аляксей Пынцікаў перайшоў у „Мінск-2006", паралельна ўдала спрабуючы сябе ў якасці тэлекаментатара, цэнтравы Аляксандр Ігнацік па стане здароўя завяршыў сваю кар'еру, пакінулі чэмпіёна таксама плеймейкер Дзмітрый Кузьмін, абаронец Леў Загайнаў і форвард Аляксандр Вярэніч. Ці змогуць належна іх замяніць навабранцы — пытанне. Іншы прэтэндэнт на золата „Гродна-93" перажывае значны фінансавы крызіс, але здолеў захаваць ранейшую моц складу. Прытым гродзенцы значна абнавілі заднюю лінію. Трэці амбітны спаборнік — асіповіцкі АЗАА — пачаў сезон з новым настаўнікам — ім стаў ветэран клуба Андрэй Ольбрэхт, які калісьці выступаў за маскоўскае „Дынама". У прадстаўнікоў Магілёўскай вобласці самая доўгая лаўка рэзервістаў. Поўны рашучасці таксама „Мінск-2006", у складзе якога заяўлены пілігрым Аляксандр Куль — магутны цэнтравы зборнай вярнуўся на радзіму. Астатнія ўдзельнікі — магілёўскі „Тэмп", гомельскі „Сож", віцебскі „Лакаматыў" (яшчэ нядаўна дабротны клуб вельмі заслаб) і мінскі БНТУ на медалі наўрад ці замахнуцца, але кроў лідэрам папсаваць здольныя. Чэмпіянат абяцае быць з інтрыгай.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Бельскія вадзянікі

Ілона КАРПЮК

Нядаўна „Ніва” гасцявала на лёгкаатлетычных спаборніцтвах, дзе свае спартовыя таленты прэзентавалі дзяўчаты з бельскай „тройкі”, а ўжо 27 кастрычніка прыйшла чарговая нагода зноўку пацікавіцца спортам у Бельску-Падляшскім.

Хаця толькі пару гадоў таму ў Бельску адкрылі гарадскі басейн, а ўжо расце актыўнасць бельскіх плыўцоў і стварыліся адпаведныя ўмовы для спартыўнага клуба „Вадзянік”. У мінулую суботу, 27 кастрычніка, адбыўся тут II Адкрыты чэмпіянат Бельска-Падляшскага ў плаванні „Залатая восень”, які адначасова быў першым міжнародным турнірам. Удзел у ім прынялі клубы з Польшчы (Радам, Пулавы, Седльцы ды Бельск) і з суседніх краін: са Светлагорска і Брэста ў Беларусі ды Коўна ў Літве. Турнір адбыўся пад патранатам бурмістра горада, а ганаровым госцем спаборніцтваў быў генеральны консул Беларусі ў Беластоку Міхал Аляксейчык, які спачатку звярнуўся да ўсіх па-польску, а пасля прывітаў моладзь па-расійску, дзеля ўзаемнага зразумення, жадаючы, вядома, шчаслівай вады.

Фота Ілоны Карпюк

Як аказалася, спаборніцтвы лёгкімі не былі, што з’яўляецца вынікам сістэмы трэніровак і колькасці ўдзельнікаў клуба.

— У нашым клубе трэніруецца каля 40 маладых плыўцоў і плыўчых, — кажа трэнер Дарыюш Ляшэвіч, — гэта мала. Праблемай з’яўляецца тое, што яшчэ бракуе моладзі і таму цяжка ладзіць трэніроўкі для паасобных узроставых груп. Але перспектывы ў нас вялікія.

З меркаваннем трэнера згодны Валеры Мяшчэр’якоў, старшыня клуба „Вадзянік” і арганізатар міжнародных спаборніцтваў. — Гэта доўгі працэс, запланаваны на 6-8 гадоў, — распавядае пра планы адносна бельскай моладзі. — Хочам развіваць таксама гэты турнір, каб маглі прыехаць сюды спаборнікі з усіх суседніх краін: Украіны, Латвіі, Эстоніі і абавязкова Расіі, — дадае.

Ахвотныя ўсе бакі. Хаця гэты турнір яшчэ ў вялікім непарадку, загадчыца аб’екта Людміла Кшывец падкрэслівае, што гэта першая спроба і, нягледзячы на нервы, будзе толькі лепш. Усё пацвярджае Тамаш Стэпанчук, галоўны суддзя гэтага дня, які бачыў не адны спаборніцтвы і ведае, што пачаткі заўсёды бываюць цяжкімі, так у арганізацыйным, як і ў трэніровачным плане. Паводле яго, плыўца можна натрэніраваць нават за два гады, але гэта мусіць быць таленавіты спартсмен. Падкрэслівае значэнне ўзросту — самы ідэальны пачынаць сур’ёзную кар’еру — гэта 13-14 гадоў. Усё здаецца быць перад бельскай моладдзю, у ліку якой дамінуюць вучні беларускай „тройкі”. Нікому з іх не бракуе матывацыі. Як сказаў мне трэнер, часта бывае так, што гэта дзеці будзяць бацькоў перад 6 раніцы ў панядзелак, бо якраз першая трэніроўка ў тыдні пачынаецца мена 6^{30}. Наймалодшым удзельнікам турніру аказалася 6-гадовая Агатка Вэсалоўская. Яна 2001 года нараджэння, але плыла з дзяўчынкамі на тры гады старэйшымі. Можа таму гэтым разам апынулася на апошнім месцы, хаця яе бацька дадае, што яна не заўсёды даплывае апошняй. Няхай Агатка будзе ўсім добрым прыкладам, бо яна не толькі плавае, але танцуе, ходзіць на каратэ, англійскую мову, а таксама, дзякуючы сяброўцы, захацела вучыцца беларускай мове, нават за свае кішэнныя грошы. Бацька, хаця яны сям’я польская, згадзіўся. Ён — любіцель, між іншым, беларускіх гуртоў „Тройца” і „Крамбамбуля”.

Пакуль што Агатка трэніруецца індывідуальна, але Дарыюш Ляшэвіч падкрэслівае, што прыкладаў не менш актыўных дзяцей у горадзе многа і часам нават няма патрэбы ў дадатковай мабілізацыі з боку трэнера. Таму спартыўныя перспектывы ёсць. Няхай доказам гэтаму будуць медалі Кубы Радзішэўскага, Норберта Вавульскага ды Ізы Ладняк, а таксама бронзавы медаль хлопцаў у эстафеце (дзяўчаты былі чацвёртымі). Канкурэнты не былі выпадковымі, дзякуючы таму ганарыцца мог беларускі консул, які даволі часта ўзнагароджваў медалямі беларускую моладзь, а эстафеты з Брэста былі першымі ў катэгорыі дзяўчат і хлопцаў.

Канкурэнцыя матывуе, але на шчасце бельская моладзь яе не баіцца, бо яна падрыхтаваная на цяжкую працу.

Наш солтыс

Мікола Нікалаюк, амаль сямідзесяцігадовы жыхар Кнаразоў, што на Бельшчыне, сёлета быў абраны солтысам. Яны — з жонкай Валянцінай — пенсіянеры, сваю гаспадарку перапісалі на сыноў. У Кнаразах 112 дамоў, але заселеных толькі 70. Ёсць і маладыя гаспадары. У некаторых сялян малако забірае малачарня, іншыя — носяць у вясковую злеўню. Дзеткі вучацца ў школе ў Храбалах і ў гімназіі ў Ягуштове. У Кнаразах ёсць крама, дзейнічаюць добраахвотная пажарная каманда і гурток вясковых гаспадынь. Спадар Мікола любіць збіраць грыбы, а жонка Валя ахвотна дзейнічае ў гуртку вясковых гаспадынь. Сваімі дасягненнямі солтыс лічыць стараннi пры рамонце дарогі з Храбалоў у Кнаразы, рамонт пад’язных дарог на палі і сенажаці, дапамогу старэйшым жыхарам вёскі пры афармленні новых пашпартоў, збор сельскагаспадарчых прадуктаў для бальніцы ў Бельску-Падляшскім. Мара солтыса — завяршыць рамонт дарогі з Кнаразоў у Зубава і паладзіць дарогу з Кнаразоў у Суботку. Жыхары вёскі звяртаюцца да спадарства Нікалаюкоў са сваімі праблемамі, а яны, па меры сваіх магчымасцей, нікому не адмаўляюць.

Наш пісьманосец

У вёсцы Зубава, што на Бельшчыне, жыве саракагадовы Яраслаў Якімюк. Ён з 1986 года працуе пісьманосцам. Апрача прафесійнай працы, разам з жонкай Міраславай гаспадарыць на зямлі. У іх двух сыноў: старэйшы Марцін вучыцца ў другім класе Гімназіі ў Ягуштове, малодшы Каміль застаецца яшчэ пад апекай мамы. Яраслаў Якімюк на сваёй машыне абслугоўвае 14 вёсак. Апошнім часам змяніліся дарогі, яны цяпер лепшыя, але зімой бывае цяжка, калі многа снегу ды слізка. Ён развозіць лісты і пенсіі сялянам. У яго многа знаёмых, людзі добра ставяцца да яго. Пісьманосца, калі прыходзіць тэрмін выплаты пенсій, асабліва чакаюць пенсіянеры. Хачу дадаць, што пакойная мама Яраслава, Ніна, калісьці прымала малако ў вёсцы. Яна сумленна выконвала свае абавязкі і да ўсіх аднавяскоўцаў адносілася ветліва. Гэтыя прыкметы яе характару пераняў сын Яраслаў.

Бацькоўскі сход

4 кастрычніка г.г. у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім адбыўся сход Рады бацькоў-дэлегатаў з паасобных класаў. Дырэктар Васіль Ляшчынскі прадставіў змены ў рэгламенце Рады бацькоў, звярнуў увагу на кволыя фінансавыя сродкі, якія атрымлівае школа і вынікаючыя з-за таго цяжкасці. Пасля старшыня Рады бацькоў Віктар Нікалаюк прадставіў фінансавую справаздачу за перыяд ад 15 снежня 2006 г. да 31 жніўня 2007 г. Найбольш эмоцый выклікала справа вучнёўскай формы. Пасля доўгіх перагавораў і аналізаў быў выбраны ўзор мундзірка і кравецкая фірма: Гандлёва-прадукцыйнае прадпрыемства „Лаўрэнцыя” ў Бельску-Падляшскім. Кошт мундзірка — 21-31 злотых.

Жэня МАРТЫНЮК

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Эдгара Хау.

1. даручэнне або просьба выканання нейкай задачы = 23 _ 24 _ 6 _ 7 _ 8 _;
2. яркая афарбоўка гарызонта перад усходам сонца = 33 _ 27 _ 14 _ 15 _;
3. конны пастух з вестэрнаў = 40 _ 39 _ 42 _ 1 _ 2 _ 3 _;
4. парнакапытная афрыканская жывёла сямейства пустарогіх (*Tragelaphus strepsicornis*) = 18 _ 17 _ 25 _ 26 _;
5. востры край рэжучай прылады = 9 _ 5 _ 22 _ 41 _;
6. з яе слова не выкінеш = 12 _ 13 _ 11 _ 20 _ 21 _;
7. горад між Віцебскам і Смаленскам зараз за беларускай мяжой = 30 _ 29 _ 28 _ 31 _32 _;
8. трубчасты орган у арганізме, па якім цячэ вадкае рэчыва, напр. кроў = 4 _ 10 _ 35 _ 34 _ 16 _;
9. памылка, промах, недахоп = 37 _ 36 _ 38 _ 19 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 39 нумара

Каена, урад, тры, крык, прыдача, два, лізол, Цвірка, цымус, Ізар, фен, юрта, цыбуля, грып, перац.

Рашэнне: **Ад парады язык не адваліцца і зубы не высыплюцца.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп’ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2008 r. upływa 5 grudnia 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2008 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 650 egz.

1 ☞ працяг

Прыстойная восень

трэба цяпер спыніцца на конкурснай частцы.

— Баюся казаць, што сёлетні ўзровень высокі, але напэўна ён роўны, — сказаў зразу пасля нарадаў журы Зміцер Вайцюшкевіч. Папярэдзіў ён аднак, што і лаўрэатаў не цяжка будзе адабраць. Тут з'явілася мая падазронасць, што конкурс можа не зусім роўны, калі так лёгка паказаць самых лепшых. Іншыя члены журы таксама здаваліся быць задаволенымі прэзентацыяй канкурсантаў. І Міхал Анемпадыстаў, і Ігар Лукашук, якія супольна з Вайцюшкевічам вырашалі вынікі конкурсу, у цёплых словах выказваліся аб выканаўцах, якімі вельмі адказна займаўся Алесь Камоцкі, яшчэ з моманту адбору ў Беларусі. Хаця да апошніх дзён большасць зацікаўленых фестывалем думала, што пабачыць у конкурсе толькі выканаўцаў з Беларусі, то арганізатары, якія заўсёды ўцякаюць ад канкрэтных адказаў, а маюць своеасаблівую рысу захапляць знянацку, падрыхтавалі неспадзяванку і дапусцілі да конкурсу ўдзельнікаў

Арганізатар і старшыня ЗБМ Лукаш Плева

Лявон Вольскі

з польскага боку: дуэт Кася Дзмітрук і Мажэна Русачык (якая два гады таму была ўзнагароджана з групай „Ілё і сябры") ды Тамаш Суліма, які атрымаў узнагароду тры гады таму ў якасці запісу матэрыялу на студыі Рэмбрандт Радыё Беласток. А што атрымалася ў канкурэнцыі з беларускім бокам? Без ніякіх сумненняў журы прызначыла Гран-пры неафіцыйнай фаварытцы конкурснай часткі Дарыі Кадамскай, якая захапіла сваім натуральным лірызмам, далікатнасцю выканання і сапраўды бардаўскай якасцю прэзентацыі. Запіс на студыё Рэмбрандт Радыё Беласток узяў ва-

Андрэй Мельнікаў

кальна-інструментальны (гітара і скрыпка) дуэт „Босае сонца". Прыгожыя гармоніі іх песень запомніліся напэўна не толькі журы. Нечакана пэўна для ўсіх узнагароду бельскай беларускай суполкі атрымаў Тамаш Суліма, які выйшаў на сцэну са сваёй першай гітарай, якую нават немагчыма добра настроіць, але Тамаш зрабіў гэта з поўнай свядомасцю.

Кася Камоцкая

— Як не дзіўна захапіў мяне Томэк Суліма, — сказаў Вайцюшкевіч пры ацэнцы конкурсу. — Ён стаў проста мужчынам. Яму цяпер усё па-барабану, стаў займацца чыстай творчасцю і не ведаю навошта яму конкурс; ён можа выступаць нармальна са сваёй праграмай.

Ці расце канкурэнцыя старой камандзе? Кася Камоцкая не баіцца ні-

Зміцер Вайцюшкевіч

якай канкурэнцыі, як і ўсе іншыя ведае сваю вартасць. Хаця сёлета Кася займалася працай над дакументальным фільмам пра „Бардаўскую восень", то мела магчымасць узрушыць слухачоў двойчы: у час суботняга канцэрта і ў прамым эфіры Радыё Беласток, дзе выступала побач лаўрэаткі Дашы Кадамскай і Зміцера Вайцюшкевіча, які на радыё выступіў без свайго гурту „WZ Orkiestra". Вайцюшкевіча можна было глядзець на сцэне Бельскага дома культуры двойчы: у пятніцу дапамог Лявону Вольскаму выканаць песню „Я нарадзіўся тут", а ў суботу, паводле ацэнкі Лукаша Плевы, старшыні Звязу беларускай моладзі і галоўнага арганізатара, наймацней за ўсіх разагрэў публіку. З яго тэмпераментам не было пэўна яму цяжка, бо побач другога шоумена, Віктара Шалкевіча, усе астатнія прэзентуюць іншы тып мастацкага выканання, эмацыянальны, але і больш сузіральны, а маю тут на думцы Касю Камоцкую, Алеся Камоцкага ды Андрэя Мельнікава, з якіх двух апошніх выступілі з канцэртам у нядзелю ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Публікі не бракавала. Хаця, здаецца, у пятніцу было крыху больш гледачоў і слухачоў. Можа таму, што традыцыйна ўжо канцэрт наведалі вучні Гайнаўскага белліцэя, а можна магнітам аказаўся Лявон Вольскі з гітарай, якога арганізатары паддалі канфрантацыі з падляшскімі выканаўцамі — з сёстрамі Жменька з Бельска-Падляшскага ды праектам „Ілё з сябрамі", што здаецца выпала пазітыўна.

Вялікіх неспадзяванак не было. Гэта, аднак, можна разглядаць у кантэксце паспяховасці сёлетняга выпуску. Аказваецца, што можна без феерверкаў падрыхтаваць добры, якасны фестываль і задаволіць публіку сапраўдным мастацтвам. Перад закідам, што і праграма гадамі амаль не мяняецца, арганізатары абараніліся пры дапамозе тэлебачання. Дзеля прыгажэйшага за-

Віктар Шалкевіч

пісу канцэртаў трэба было памяняць мастацкае афармленне, што атрымалася дзякуючы перад усім святлу і дыму. У спалучэнні з цікавымі, у вялікай ступені новымі праграмамі выканаўцаў атрымалася новая якасць, названая проста прыгажосцю фестывалю. Так як і ў час сёлетняга „Басовішча" вялася трансляцыя ў прамым эфіры Радыё Рацыя і на сайце www.racyja.com. Гэта паказвае сучасныя магчымасці, але гэта таксама і прыклад таму, што варта часам паддацца мас-медыям, якія ў большай ступені нясуць карысць і не адбіраюць мерапрыемству арыгінальнасці.

Алесь Камоцкі

Хаця слова „прыгажосць" не ўвасабляе поўнай вартасці фестывалю „Бардаўская восень", то думаю аднак, што гэта справядлівая ацэнка сёлетняй карціны мерапрыемства, якая паказвае значэнне эстэтыкі ў музычнай творчасці.

Ілона КАРПЮК

04.11 – 10.11

Баран (22.03. — 20.04.) Пакажаш моцную волю, мэтанакіраванасць, стойкасць. Нават вострая спрэчка не пашкодзіць тваім пачуццям. Будзеш цяпер тытанам працы, не знеахвоцяць цябе найцяжэйшыя заданні.

Бык (21.04. — 21.05.) 4-8.11. лепш не выбірайся на рандэву. Можаш закахацца ў таксічную асобу, якая выкарыстае цябе і знішчыць. Кепскі час і на інтарэсы. Калі будзеш цаніць лаяльнасць і адказнасць, шчасця ў пачуццях табе хопіць.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Незвычайная любоўная прыгода. Нават калі да гэтай пары цябе не брала чужая краса, прападзеш на ўсю катушку! Да партнёрства падыдзеш лёгка, не прымаючы пад увагу эмоцый чалавека, якому на табе залежыць.

Рак (23.06. — 23.07.) Трывожыць цябе будзе пачуццё зайздрасці. Не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць; хутка бяры лёс у свае рукі. 10.11. — спрыянне любоўным заваёвам; можаш трапіць на кагосьці таямнічага, уражлівага і таленавітага.

Леў (24.07. — 23.08.) Без праблем ажыццявіш кожны план дзякуючы сіле волі і рашучым вырашэнням. Творчасць, небанальнасць, прага змен.

Дзева (24.08. — 23.09.) Без цяжкасцей раскусіш складаную праблему і развяжаш кожную загадку. Цяжка ўстаяць перад тваім тэмпераментам, ілюзорна халодным.

Шалі (24.09. — 23.10.) Да 8.11. магчымыя цяжкасці ў фінансах; не бярыся за важныя вырашэнні, але і не паддайся сумненням. Радасць, поўня жыцця, надзеі на будучыню. Апынешся ў новых акалічнасцях, сярод спрыяючых табе людзей.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Да 7.11. будзеш запальчывы, бескампрамісны; не палі за сабой мастоў і нічога не абяцай. Да 8.11. фінансавыя клопаты, зайздрасць, неахвота прызнацца да ўласных памылак, боязь перад адкрытасцю. 10.11. дзякуючы тваёй сугестыўнасці дасі рады з кожным праектам.

Стралец (23.11. — 22.12.) У каханні куй жалеза пакуль гарачае, бо новы шанц доўга не паўторыцца. Калі будзеш ад сябе патрабаваць таго, што і ад іншых, на працы пазбегнеш непатрэбных скрыгатаў.

Казярог (23.12. — 20.01.) Знакамітая сарганізаванасць. Лёгка дасягнеш сваіх мэт, умела ажыццявіш свае рашэнні. Самастойныя вырашэнні будуць трапныя. Малым высілкам дасягнеш фінансавага поспеху.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Прабудзішся да новага жыцця. Будзеш радасны, дасціпны, творчы, самаўпэўнены, але не будзеш дзерці нос. Сваёй жарснасцю захопіш іншых. Больш дасягнеш, калі пойдзеш сваёй дарогай.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Чакае цябе палымянае каханне, якое закрутне табе ў галаве. 10.11. — знакаміты час на пачатак падарожжа, важную размову, здабыванне ведаў. 10.11. не давярай неадпаведным асобам. Увесь месяц не вельмі добрыя канфігурацыі з людзьмі, лішняя даверлівасць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Маўзалей Шульцаў - III

Ніва

ПРА ГМІННАЕ

Лявоневічы - IV

Расследаванне „Нівы"

Канец дрэваапрацоўчай Гайнаўшчыны?

Аляксей МАРОЗ

Можна сказаць, што Гайнаўка ўзнікла і разраслася, абапіраючыся на дрэваапрацоўчую прамысловасць. Зараз таксама працу ў асноўным даюць прадпрыемствы, якія выпускаюць вырабы з драўніны. Узнікае пытанне ці ў час, калі Белавежская пушча штораз лепш ахоўваецца і рэальнымі становяцца планы, каб на ўсёй яе тэрыторыі стварыць нацыянальны парк, Гайнаўка і яе наваколле надалей будуць стаяць на дрэваапрацоўчай прамысловасці? Каб адказаць, трэба ў першую чаргу праверыць адкуль гайнаўскія і прыгарадскія прадпрыемствы, якія ў папярэдніх дзесяцігоддзях выраслі як грыбы пасля дажджу, бяруць лесаматэрыял і даведацца пра магчымасці завозу драўніны для перапрацоўкі з-па-за Белавежскай пушчы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У прадпрыемстве „Трэс-Поль" у Навасадах перапрацоўваюць цяпер толькі сасну, якую купляюць па-за Белавежскай пушчай (але ў Польшчы)

Лесаматэрыял з-па-за Белавежскай пушчы

Свае першыя крокі накіраваў я да вядомага ў Гайнаўцы сталяра Анатоля Аксэнтовіча, які разбудаваў сваю сталярню ў невялікае дрэваапрацоўчае прадпрыемства, у якім знайшло работу каля дзесяці чалавек. Менавіта дзякуючы такім невялікім прадпрыемствам узмацняліся гаспадаркі ў заходніх краінах і мацнее гаспадарка ў Польшчы, а людзі з невялікіх мясцовасцей знаходзяць работу.

— Я ўжо гадоў пяць, ці нават шэсць практычна не купляю лесаматэрыялу ў Белавежскай пушчы, бо з узмацненнем яе аховы вельмі абмежавалася продаж дубу і ясеню, з якіх я выконваю паркеты і лесвіцы. Калі зараз прапануецца продаж гэтых лесаматэрыялаў з нашай пушчы, адбываецца яна ў невялікіх колькасцях, — заяўляе Анатоль Аксэнтовіч. — Лесаматэрыял для свайго прадпрыемства найчасцей купляю ў Барэцкай пушчы, а канкрэтна ў Круклянках і ад прадпрыемстваў, якія гандлююць драўнінай. Не так даўно прапанавалася продаж дубу ў Надлясніцтве Броўск, але цана была намнога вышэйшая, чым у Барэцкай пушчы і за гэтыя самыя грошы можна было купіць драўніну на Мазурах і прывезці яе сюды.

Аднак у выпадку прадукцыі з якасных лесаматэрыялаў узнікае пытанне ці хопіць іх у іншых лясах Польшчы, ці можа трэба будзе шукаць дубу або ясеню па-за межамі нашай краіны. Частка большых гайнаўскіх дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, у якіх працуюць дзесяткі чалавек, ужо і зараз сваю прадукцыю абапірае ў галоўным на імпартныя лесаматэрыялы. Напрыклад, дуб і ясень завозяцца з-пад Калінінграда або з Украіны, а сасна — з Літвы. Зараз уласнікі вялікіх прадпрыемстваў неахвотна рассакрэчваюць месцы куплі сыравіны, апасаючыся актыўнасці канкурэнтных ім суполак. Валянцін Васілюк са Звадзецкага расказаў толькі пра напрамкі імпарту лесаматэрыялу.

— Мы сто працэнтаў лесаматэрыялу прывозім з-за мяжы. Купляем яго не толькі ў краінах за нашай усходняй мяжой, але прывозім з Азіі, Афрыкі і Амерыкі. З якасных матэрыялаў выконваем, між іншым, дэталі для мэблі. З горшага матэрыялу робім паркеты, — кажа Валянцін Васілюк. Прадпрыемства „Васбэль", якое вядзе ён разам з сынам, дае працу амаль шасцідзесяці асобам.

Прадпрыемства „Трэс-Поль" з Навасадаў, у якім працуе пад сорак асоб, перарабляе выключна сасну.

— Мы раней куплялі сасну ажно ў далёкай Сібіры. Быў гэта вельмі якасны матэрыял, але зараз менш сыравіны прывозіцца і з гэтага напрамку. Цяпер лесаматэрыял для нашага прадпрыемства купляем выключна ў Польшчы: у Супраслі, Крынках, Белай-Падляшскай і іншых месцах, — інфармуе саўласнік прадпрыемства Уладзімір Трашчотка з Навасадаў. — Аднак у Польшчы зараз не хапае драўніны, якая выкарыстоўваецца ў розных галінах будаўніцтва. Мы яшчэ ў гэтым годзе хочам дакупіць 600 кубаметраў сасны, бо толькі яе выкарыстоўваем у нашым прадпрыемстве і не можам знайсці прадаўца.

Уладзімір Трашчотка і іншыя мае суразмоўцы наракалі на рост цэн лесаматэрыялу, які абмяжоўвае магчымасці развіцця іх прадпрыемстваў.

— Ужо і зараз цана дубу ці ясеню павышаецца штогод недзе на 20%, а да гэтага трэба яшчэ дабавіць рост коштаў вытворчасці, на які вялікае ўздзеянне мае рост зарплат. Узнікае небяспека, што пры высокіх цэнах, напрыклад, паркету, абмяжуецца зацікаўленне ім і зменшыцца продаж нашых вырабаў, — кажа Анатоль Аксэнтовіч.

Буйная гайнаўская фабрыка, якая яшчэ ў сямідзесятых гадах называлася Гайнаўскім прадпрыемствам дрэваапрацоўчай прамысловасці і давала работу прыблізна двум тысячам чалавек, пераўтварылася ў суполку „Фурнель" (доўгі час працавала ў ёй больш за тысячу асоб). Ужо ў суполцы сталі абмяжоўваць аб'ём вытворчасці і колькасць рабочых. Не так даўно гэтая суполка стала адной з фабрык мэблі групы „Фортэ" і яе працаўнікоў можна лічыць ужо ў сотнях чалавек. Хаця апошнім часам група „Фортэ" зрабіла мільённыя інвестыцыі ў гайнаўскую фабрыку і пры гэтым павялічыла колькасць работнікаў, хутчэй за ўсё прадпрыемства не зможа дайсці да колькасці работнікаў з папярэдніх дзесяцігоддзяў. Фабрыка мэблі групы „Фортэ", так як і папярэдняя суполка „Фурнель", паставілі на прадукцыю якаснай мэблі з выкарыстаннем сучасных тэхналогій і дарагіх машын. Яшчэ суполка „Фурнель" стала прадаваць свае ўчасткі з вялікімі будынкамі. Прадпрыемства стала адыходзіць ад комплекснай перапрацоўкі сырой драўніны прывезенай з лесу і стала купляць уступна перапрацаваны лесаматэрыял, прыгодны для далейшай апрацоўкі (зараз „Фортэ" не купляе лесаматэрыялу непасрэдна ў Белавежскай пушчы). У гайнаўскай фабрыцы вырабляецца цяпер мэбля ў вялікай ступені выкананая з драўляных матэрыялаў і мэбля абклееная фанерай.

Драўніна з нашай пушчы

Каб зарыентавацца ў продажы лесаматэрылаў з Белавежскай пушчы для прадпрыемстваў і індывідуальных пакупнікоў, наведаў я адно з трох надлясніцтваў, якія ўпраўляюць гаспадаркай у дзяржаўных лясах нашай пушчы. На 2007 год у Надлясніцтве Гайнаўка прадбачваецца продаж 42 700 кубаметраў драўніны.

— Наша міністэрства дазваляе нам прадаваць да 49 тысяч кубаметраў лесаматэрыялу ў год, у адпаведнасці з дзесяцігадовым планам. Калі рэалізавалі мы апошнюю дзесяцігодку, у нашым надлясніцтве створаны быў запаведнік „Натураль-

працяг ☞ II

9 770546 196000

І ☞працяг

Канец дрэваапрацоўчай Гайнаўшчыны?

ныя лясы” плошчаю ў 4 тысячы гектараў, дзе мы практычна спынілі высяканне, — кажа намеснік надлясніча Васіль Валкавыцкі. — Калі ўзяць пад увагу, што мы гаспадарым на 20 тысячах гектараў, то ў сярэднім прадаем мы па 2 кубаметры драўніны ў год з аднаго гектара лесу. Гэта абазначае, што карыстаемся толькі ў 40-50% тым, што прырастае ў нашых лясах. На перашкодзе да больш поўнага гаспадарчага выкарыстання лесу стаяць забарона высякання найстарэйшых дрэў і больш строгая ахова пушчы ў нашых запаведніках.

Дзесяць тысяч кубаметраў драўніны Гайнаўскае надлясніцтва прадае прыватным пакупнікам, якія не займаюцца яе перапрацоўкай, каля 30 тысяч кубаметраў лесаматэрыялаў купляюць прадпрымальнікі і прыблізна 2 тысячы кубаметраў надлясніцтва выкарыстоўвае на ўласныя патрэбы. Зараз больш дроў патрабуюць жыхары вёсак і гарадоў, якія індывідуальна абагравацьць свае дамы. Раней карысталіся яны таксама адкідамі драўніны. Танна куплялі яны кару і пілавінне, якімі абагравалі свае дамы. Зараз гэтымі адкідамі карыстаюцца самі прадпрымальнікі і найчасцей прадаюць іх буйной гарадской кацельні ў Гайнаўцы.

— У 2006 годзе прадалі мы каля 50% драўніны пакупнікам з Гайнаўскага павета, каля 30% іншым пакупнікам з Падляшскага ваяводства і толькі пад 20% у іншыя рэгіёны Польшчы, — паведаміў Васіль Валкавыцкі.

Мясцовыя прадпрымальнікі пачалі наракаць на абмежаваны доступ да лесаматэрыялу з Белавежскай пушчы ў 2007 годзе, калі ўвесь продаж прадпрымальнікам адбываецца толькі праз пасрэдніцтва Інтэрнэту. Раней прадпрымальнікам з розных гарадоў Польшчы трэба было прыязджаць на размовы ў Гайнаўку, а зараз могуць яны заказваць драўніну ў Белавежскай пушчы седзячы дома за камп’ютэрам. Мае суразмоўцы з Гайнаўшчыны наракалі менавіта на спосаб продажу лесаматэрыялу Дзяржаўнымі лясамі па Інтэрнэце.

— Калі прадпрымальнікі з розных мясцовасцей Польшчы плацяць больш, купляюць праз Інтэрнэт лесаматэрыял у нашай пушчы, нам не хапае драўніны для прадукцыі. Я мог бы выконваць больш вырабаў з драўніны, але абмяжоўваю вытворчасць з-за нястачы сыравіны, — заявіў Анатоль Дунда, які вырабляе доўгую шалёўку ды рэжа і сушыць дошкі на заказ.

— Продаж з выкарыстаннем Інтэрнэту ўведзена ва ўсёй Польшчы і прапановы, з якімі выступаюць да нас прадпрымальнікі, аналізуе толькі камп’ютэрная праграма і яна вырашае, з кім падпісваць дамовы на продаж лесаматэрыялу на гадавы перыяд, — заявіў намеснік надляснічага Васіль Валкавыцкі. — Калі дадаткова прадавалі мы елкі, якія нішчылі караеды, пакупнікі ў час аўкцыёнаў павышалі прапанаваную намі цану ад 40% нават да 77%. У гэтым годзе ў Польшчы многа будуецца і мабыць таму так многа трэба было плаціць за драўніну з дадатковага продажу.

У Гайнаўскім надлясніцтве ў агульным ліку прадаваных лесаматэрыялаў найбольш елак (30%), бярозы (24%), сасны (15%), а апошнюю частку састаўляюць у галоўным ліставыя дрэвы. Мой суразмоўца пацвердзіў, што дуб і ясень прадаюцца толькі ў невялікіх колькасцях. Паколькі паходзяць яны з высечак у маладым лесе, выкарыстоўваюцца ў галоўным на дровы.

— Яшчэ да паловы сямідзесятых гадоў прадавалі мы нават пад 100 тысяч кубаметраў драўніны ў год. Пасля гэтая колькасць паменшала і ўжо ў васьмідзесятых і дзевяностых гадах прадавалі мы прыблізна каля 40 тысяч кубаметраў штогод. Такі продаж трымаецца таксама ў гэтым дзесяцігоддзі, — інфармуе намеснік надляснічага Васіль Валкавыцкі. — Самыя вялікія змены, гэта амаль спыненне з 1998 года продажу дубу і ясеню для прадукцыі, калі быў забаронены продаж дрэў ва ўзросце большым чым сто гадоў. Спыніўся тады таксама продаж найстарэйшых сосен і іншых дрэў.

Якая будучыня?

— Не бачу я светлай будучыні для дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Толькі да канца 2008 года можна будзе купляць лесаматэрыял у Расіі, Беларусі ці Украіне непасрэдна з лесу. Пазней можна будзе прывозіць з гэтых краін толькі перапрацаваную драўніну. У Польшчы таксама будзе абмяжоўвацца доступ да дубу ці ясеню. Трэба будзе шукаць сыравіну штораз далей, а кошт транспарту будзе павышаць яе цану, — кажа Валянцін Васілюк са Звадзецкага. — Можа прыйдзецца пакінуць дрэваапрацоўчую прадукцыю, а пачаць займацца гандлем.

— Ужо і зараз абмежаваны доступ да лесаматэрыялаў у Польшчы і штораз цяжэй купляць драўніну за мяжой. Яшчэ многа лесаматэрыялу прадаецца ў Нарвегіі, але драўніну купляюць там немцы і расіяне, — інфармуе Уладзімір Трашчотка з Навасадаў. — Малым прадпрыемствам цяжка будзе выжыць пры абмежаваным доступе да лясной сыравіны з Белавежскай пушчы. Большым хіба трэба будзе распачаць больш спецыялізаваную прадукцыю. Мы, напрыклад, зараз выпускаем, між іншым, сасновыя паўфабрыкаты для аконнай сталяркі і дзвярных рамаў. Можа трэба будзе абмежаваць прадукцыю і пачаць выпускаць цэлыя драўляныя вокны.

А вось што аб будучыні гайнаўскіх дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў мяркуе намеснік бурмістра Гайнаўкі.

— Вельмі вялікае значэнне для дзейнасці нашых невялікіх прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці ў будучыні будуць мець вырашэнні ў справе аховы Белавежскай пушчы і доступу мясцовых прадпрымальнікаў да мясцовых лесаматэрыялаў. Калі будзе ўведзена поўная ахова пушчы і нашы сталяры не будуць мець доступу да мясцовай драўніны, гэта адмоўна паўплывае на вытворчасць нашых прадпрымальнікаў, у якіх няма магчымасцей, або яны абмежаваныя, купляць драўніну далёка ў Польшчы, — заявіў намеснік бурмістра Гайнаўкі Васіль Сцепанюк.

З прыведзеных ім даных відаць, што колькасць сталяроў у Гайнаўцы крыху паменшала на працягу апошніх дзесяці гадоў. Затое ў гэтым часе намнога пабольшала колькасць прадпрыемстваў, якія займаюцца сталярскімі паслугамі, але частка з іх напэўна выконвае работу ў Варшаве ці іншых вялікіх гарадах Польшчы.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў звычайным людзям на Гайнаўшчыне ўдалося пераўтварыць свае сталярскія варштаты ў большыя прадпрыемствы, у якіх зараз працуе па пяць, дзесяць або нават па некалькі дзесяткаў асоб. Яны і стварылі хіба асноўныя канкурэнтныя для вялікага гайнаўскага дрэваапрацоўчага прадпрыемства месцы работы на Гайнаўшчыне. Самым вялікім капіталам ува ўсіх дрэваапрацоўчых прадпрыемствах у Гайнаўцы і яго наваколлі з’яўляюцца кваліфікаваныя людзі, з адпаведнай адукацыяй, вопытам і магчымасць выкарыстання сучасных тэхналогій, якія цяпер сталі неабходнасцю. Ёсць надзея, што большыя гаспадарчыя адзінкі патрапяць і ў будучыні здабываць сабе сыравіну па-за месцам прадукцыі. Пры вялікім абмежаванні доступу да лесаматэрыялу з Белавежскай пушчы хутчэй за ўсё праблемай стане здабыванне сыравіны для невялікіх прадпрыемстваў і сталярняў, дзе, напрыклад, прадпрымальнік працуе разам з сямейнікамі і карыстаецца толькі часовай падтрымкай наёмных работнікаў. Ва ўмовах рынкавай эканомікі невялікія варштаты могуць апынуцца пад пагрозай спынення дзейнасці.

Аляксей МАРОЗ

Аб гміннай уладзе

Уладзімір СІДАРУК

У 40 нумары „Нівы” ад 7 кастрычніка друкаваўся допіс Марка Цыбарта „Некалькі слоў аб нашай гміннай уладзе...”. Аўтар заяўляе, што штуршком для гэтай публікацыі стала карэспандэнцыя Міхася Куптэля, у якой ён заахвочваў карэспандэнтаў аказваць уплыў на працу гмінных радаў. Хачу адзначыць, што Міхась Куптэль кранаў гэтую тэму ў час нашай сустрэчы ў Рэпчычах. У нас на гэты конт узніклі спрэчкі. Зараз хачу адзначыць, што ў мяне такая ж думка, як у сябры Цыбарта (прыклады і аргументы ім прыведзены быццам з майго асяроддзя ўзяты). Пагаджаюся з аўтарам, што наш уплыў на працу Рады гміны ў даны момант нерэальны. Войт рэалізуе свае планы пры дапамозе „сваіх” радных, якіх сам падбірае ва ўправу. Памятаю, як некалькі гадоў таму ў Чаромсе было. На ўрачыстым адкрыцці Рады гміны была прад’яўлена прапанова, што ва ўправу гміны палову членаў прад’явіць войт, а другое столькі ж радныя з залы. І тут узнік закалот. Радныя прад’явілі толькі аднаго кандыдата, бо войт сказаў: „Калі мне даверылі на выбарах, дык я дабіраю каманду, з якой буду працаваць”. Так і было. Я згодны з думкай Марка Цыбарта наконт таго, каб „уладу мясцовых царыкаў абмежаваць да двух тэрмінаў”. Абедзвюма рукамі падпісваюся пад гэтай ідэяй. Восем гадоў на пасадзе войта ці бурмістра гэта шмат часу. Калі такі закон устанавілі для прэзідэнта краіны, дык чаму не ўстанавіць і для кіраўнікоў самаўрадаў. І з аргументацыяй таксама пагаджаюся. Маладым адукаваным людзям трэба даць шанц. Мінулае паказвае, што шматгадовыя войты-ветэраны прымяняюць розныя фокусы і хітрыкі, каб толькі застацца на пасадзе. А пасля гавораць, што ім даверыў народ. Не стану паўтарацца ў тым, што я раней пісаў аб Чаромхаўскай гміне. А вынік ад гэтага які? Уладару волас з галавы не зляцеў, а я ворагаў нажыў пэўна да апошніх сваіх зямных дзён. Падтрымліваю думку Марка Цыбарта ў гэтым, што пара змяніць закон аб самаўрадах і абмежаваць знаходжанне войта і бурмістра на пасадзе да двух тэрмінаў.

Гайнаўскія сыры

Зараз вялікім поспехам у спажыўцоў карыстаюцца перш-наперш жоўтыя сыры Гайнаўскага малочнага завода: „эдамскі”, „гоўда” і „падляшскі” ды ад нядаўна „царскі”. Гэты апошні з’яўляецца найдаражэйшым вырабам малачарні, м.інш., па прычыне складанай рэцэптуры і трохмесячнага выспявання.

„Царскі” сыр мае прыпамінаць гісторыю рэгіёна. Ён супаў з часам, калі адкрылі рэстаран „Царскі” ў Белавежы.

Апошнім часам вялікай папулярнасцю карыстаецца таксама белы сыр „клінок”. Гайнаўскія малочныя вырабы трапляюць на айчынны рынак ды на сталы ў Германіі, Расіі (сюды асабліва „царскі” сыр), Чэхіі і ў іншыя еўрапейскія краіны. За мяжу гайнаўскае прадпрыемства высылае шмат тварагу і смятаны ды ў вялікіх колькасцях экспартуе сухое малако.

Смак гайнаўскіх вырабаў найлепшы. А гэта таму, што малако паходзіць з раёна Белавежскай пушчы, а тут кароў традыцыйна кормяць натуральным кормам. Гэта абумоўлівае найвышэйшую якасць. **(мох)**

Падаткі

17 кастрычніка г.г. на сесіі Гміннай рады ў Нараўцы (Гайнаўскі павет) радныя ўстанавілі некаторыя стаўкі сельскагаспадарчага падатку ў 2008 годзе на тэрыторыі Нараўчанскай гміны. Зацвердзілі таксама стаўкі падатку за нерухомыя маёмасці, м.інш.

— за 1 квадратны метр выкарыстоўваемай плошчы жылых будынкаў або іх часткі — 0,56 зл. (на 2 грошы больш чымсьці ў 2007 годзе);

— за 1 квадратны метр выкарыстоўваемай плошчы будынкаў або іх часткі, у якіх вядуць гаспадарчую дзейнасць, а таксама за жылыя будынкі або іх частку, занятых дзеля гаспадарчай дзейнасці — 16,89 зл. (больш на 37 грошаў);

— за 1 квадратны метр выкарыстоўваемай плошчы астатніх будынкаў або іх часткі, выключаных з-пад перахвату ў ходзе перадачы сельскіх гаспадарак у дзяржаўнае казначэйства — 3,19 зл. (больш на 8 грошаў);

— за 1 квадратны метр дачных домікаў — 6,35 зл. (больш на 15 грошаў);

— за ўчасткі зямлі занятай пад вадасховішчы — 3,74 зл. за гектар (больш на 9 грошаў). **(ян)**

Разведка Вулькі-Выганоўскай

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Наша тутэйшая чыгунка дае нам магчымасць забаўляцца рознымі асацыяцыямі. Вось яшчэ нядаўна, калі ўводзілі г.зв. рэйкавыя аўтобусы на лінію з Беластока ў Чаромху, выглядалі яны надта сучасна, мелі кандыцыянеры і аэрадынамічны кшталт, з-за чаго дзе-хто называў іх нават мянушкай „тэ-жэ-вэ", бо ж падобна выглядаюць і славутыя французскія суперскорыя і суперкамфартабельныя паязды. Але час, колькі б яго не прамінула, вяртае наша старонне ў г.зв. Польшчу „Б", у тым ліку і на чыгунцы. „Тэ-жэ-вэ" чэзнуць з нашых рэек, а на іх месца пранікаюць скрыні на колах з месцамі для сядзення ўсярэдзіне. Да таго ж разам з сучаснымі вагонамі ад'ехалі ад нас сімпатычныя праваднічкі, а заміж іх паказаўся кандуктар з усмешкай у выглядзе кавалка фартэпіяннай клавіятуры. „Новыя" машыны крыху нагадваюць вестэрнавыя дыліжансы, бо і чыгуначныя прыпынкі больш нагадваюць забарыкадаваныя паселішчы Дзікага Захаду, да якіх меў бы набліжацца славуты рэвальвершчык Billy the Kid. Калі ж у пачакальні не забіты наглуха вокны і дзверы, тады не мінаваць ёй лёсу прыпынка, якому назва Сухавольцы. Гэты прыпынак у даволі бязлюдным месцы, у найбліжэйшыя вёскі — Сухавольцы і Вулькі-Выганоўскую — будзе па тры кіламетры адлегласці. Гэта добры палігон для бесперашкоднай развальной гульні.

Усё ж такі ў эпоху, калі ставілі пачакальню ў Сухавольцах, яе будаўнікі думалі даволі перспектыўна, па-еўрапейску. На пероне ўсё яшчэ стаяць асвятляльныя слупы, але на ніводным з іх няма ні лямпаў, ні аправаў. Зайшоў я і ў зарослую ўсялякай расліннасцю камеру, куды нават фальклорны цар пяшком ходзіць. Дзіра ў бетоннай падлозе сведчыць пра вядомы цывілізацыйны стандарт, але ж у сценах тырчаць электраправады для асвятлення гэтай адтуліны ў цёмны час. Паўвека таму некаторыя людзі марылі пра „лямпачкі Ільіча" тут, пра Еўропу. І тыя мары па сённяшні час астаюцца найбольш трывалай тутэйшай рэальнасцю. Можна нават сказаць, што Ленін вечна ў нас жывы. Нават вынікі парламенцкіх выбараў паказваюць гатовасць г.зв. Усходняй сцяны да такой грамадскай зачысткі, якую калісь былі правялі бальшавікі.

На прыпынку, апрача мяне, злезлі з поезда яшчэ жанчына з мужчынам. Неўзабаве дагнаў я іх. Дабрадушная жанчына сказала мне, што зараз па яе спадарожніка прыедзе транспарт, які і мяне можа забраць; я, падзякаваўшы, адмовіўся. Праз некаторы час паказаўся трактар з боку Вулькі-Выганоўскай з прычэпленай валкавой цюкаркай, які неўзабаве паехаў назад, везучы на крылах новы экіпаж з нядаўніх чыгуначных пасажыраў.

Уся вялікая прастора нядаўніх палёў, што распасціраецца між Рыгораўцамі і Вулькай-Выганоўскай, зараз абсаджана маладым лесам. Калі б так уявай вярнуцца на дваццаць-трыццаць гадоў назад, тады між буйных цяпер пасадак паказаліся б нівы, якія люд вясковы дробіў з году ў год. Якую яны калісь мелі вартасць, якім пасагам былі гектары, калі лады пачыналіся ад пытання сватоў пра свінак і каровак у хлявах! І цікава, колькі цяпер рогату выклікала б рэклама дзеўкі такімі козырамі...

Пакінуў малады народ і гектары, і Вульку-Выганоўскую, не відаць у вёсцы вялікага размаху. Зайшоў я быў на солтысаў панадворак, але гаспадар вёскі заняты руплівай падрыхтоўкай да зімы, а я не хачу займаць яму часу пытаннямі, на шмат з якіх адказ і так стандартны.

Заглядаю ў вялікі будынак былой школы; цяпер на ім старая-старая шыльда пажарнай каманды. Дзверы ў будынак адкрыты, заходжу ўсярэдзіну. У адной зале аўдыторыя са сцэнай, у другой пінг-понгавы стол пасярэдзіне. А ў куточку столік, на якім край займаюць ракеткі, а апошнюю плошчу — шчыльны натоўп шкляных бутэлек з-пад піва. У невялікай канторцы стол аружаны абабітымі дэрмацінам крэсламі; тут бляшаныя банкі з-пад піва на акне. Можа хто назваў бы гэта і непарадкам, але ж тара не раскідана, толькі пакінута, бо і куды ж яе дзяваць?..

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Царква ў Вульцы-Выганоўскай

Падаюся ў напрамку Паўлінова. Вёска невялікая, акуратная. У адным з агародчыкаў бабулька ўзрыхляе зямлю. Заходжу ў солтысаў дом. Гаспадары вёскі наймалодшыя ў ліку 26 яе жыхароў, абаім пад шэсцьдзесят. Не могуць яны прыгадаць, калі ў Паўлінове згулялі апошняе вяселле, а апошняе вяселле ўраджэнца Паўлінова адбылося ў Бельску каля дзесяці гадоў таму. Яшчэ некалькіх гаспадароў абрабляе перапісаную на дзяцей зямлю, некаторыя трымаюць крыху кароў, малако ад якіх завозяць у пункт скупкі ў Вульцы-Выганоўскай.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Школьны будынак у Вульцы-Выганоўскай

Іду далей. За вёскай пажылыя жанчына з мужчынам грузяць дровы на прычэплены да трактара воз. На могілках маўзалей Шульцаў, колішніх паноў Паўлінова, змагаецца яшчэ з часам, але падтрымкі збудаванню ад нікога няма, а вартая тая гістарычная каплічка ўвагі...

На балотах, што вакол верхняга цячэння Нурца, пуставата. Побач дарогі з Паўлінова ў Малочкі нехта скінуў тапчан, паставіўшы на ім транзістарны радыёпрыёмнік. Гэта яшчэ свежае, сёлетняе вывяржэнне хатняй непатрэбшчыны. Мабыць, нехта старэнькі жыў у сваёй вясковай хатцы, а калі жыццё закончыў, спадкаемцы ягонай хаты вывезлі непатрэбную ім мэблю абы далей. Калі б яны ў той хаце жылі, можа той тапчан на дровы парубалі б, можа металічныя яго часткі здалі б у пункт скупкі металалому, а можа нейкаму кавалю, калі б такі быў у наваколлі. Але навошта такія захады, калі непатрэбны прадмет можна пацiху і бестурботна выкінуць у траву, якой і так ніхто не косіць, ды гайда ў свой горад!..

У Вульку-Выганоўскую заглянуў я некалькі дзён пазней, бо так быў дамовіўся з солтысам Юрыем Васілеўскім. А ён зноў заняты, бо ж на вёсцы работы не пераробіш. Усё ж такі хвілін пару адвёў ён мне.

У Вульцы-Выганоўскай пражывае больш за сто чалавек, у тым ліку дзесяць дзяцей школьнага ўзросту ў пяці сем'ях. Таварнай гаспадаркай займаецца толькі адзін жыхар вёскі, які разводзіць свіней і вырошчвае збожжа. Адзінаццаць гаспадароў здае малако ў мясцовы пункт прыёму, у які гэтую сыравіну пастаўляюць таксама сяляне з Чахоў-Забалотных, Москаўцаў, Круглага і згаданага раней Паўлінова. Адзін вульчанскі гаспадар разводзіць авечак дзеля экспарту бараніны ў Італію. Пустуе кожная дзесятая хата.

Цікаўлюся будынкамі былога калгаса, што за вёскай. Той калгас, калі Гамулка дазволіў на роспуск такіх гаспадарак, за два дні раскідаўся. З таго часу будынкі нішчэлі да 1970-х гадоў, калі імі стаў карыстацца бельскі пэгеэр. Крыху раней прымяркоўвалі да іх завод перапрацоўкі садавіны, які, аднак, пабудавалі ў Сямятычах. Пэгеэр дзейнічаў „да Валэнсы", пасля яго маёмасць пераняў арлянскі эскаэр, а калі і той упаў, заняла яго прыватніца з Бельска-Падляшскага.

Была ў Вульцы-Выганоўскай і база арлянскага геэсу. Скуплялі там жывёлу, прадавалі вугаль і мінеральныя ўгнаенні. Аднак калі тыя будынкі сталі геэсу непатрэбнымі, купіў іх згаданы раней фермер і цяпер там трымае збожжа. Карыстаецца ён таксама будынкамі колішняга калгаса ў Москаўцах; сам ён родам з Сакоў... З геэсаўскіх аб'ектаў асталася ў Вульцы-Выганоўскай толькі прадуктовая крама.

Школьны будынак цяпер выконвае ролю святліцы, але нішчэе, бо гміна не ў змозе яго ўтрымаць, бо надта вялікі — 325 квадратных метраў паверхні! Вяскоўцы хочуць прадаць сваю ранейшую школу і за выручаныя грошы купіць сучасную пажарную машыну. У Вульцы-Выганоўскай трыццаць пажарнікаў, якія карыстаюцца „Жукам", які не забірае вады. А тут патрэбная салідная машына, бо паблізу сенажаці з торфам і трэба з сабою мець прынамсі тры тысячы літраў вады. А ў „Жук" што возьмеш? Хадай-

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Пачакальня ў Сухавольцах

працяг ☞ IV

У бок Ялоўкі

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

У Лявоневічы заходжу каля восьмай гадзіны раніцы з дарогі, што калісь вяла з Рудні. І адразу бачу асаблівы рух: вуліцай справа крочыць пад дзесяць пажылых жанчын. Далучаюся да іх і пытаю, што гэта ў іх за шэсце.

— Праводзілі пакойніцу, — адказваюць.

— А чаму ж толькі адны жанчыны? — пытаю далей.

— Бо мужчыны разышліся раней. Ім больш спешна.

— Ну так, — падводжу прывітанне, — мужчыны спяшаюць, хутчэй жывуць і хутчэй паміраюць, пакідаючы саміх жанчын.

Мае спадарожніцы адлучаюцца да сваіх хат і хутка астаюся толькі з адной, якая жыве недалёка за вёскай. Інфармуе яна мяне, што гаспадаркай у ейнай вёсцы займаецца толькі двух сялян, у тым ліку і яе сын. Трымаў ён раней кароў, але цяпер асталося ў яго дзве. Але ж за вёскай, у напрамку Грудкоў, відаць вялікую чараду кароў, а за імі доўгі радок цюкаваных кулёў, які выглядае быццам белая агароджа пашы. Падпытваю субяседніцу, ці не сотня кароў будзе ў бачаным на гарызонце статку.

— Можа і будзе столькі, — адказвае яна мне. — Саміх малочных то пяцьдзесят або і шэсцьдзесят мае.

У Лявоневічах толькі ў дзвюх сем'ях ёсць дзеці — у тых менавіта сем'ях, што гаспадараць.

Сама вёска выглядае сумнавата. Не відаць у ёй гаспадарскага руху. Зараз пасля развітання са згаданай раней субяседніцай на двух панадворках прыкмячаю легкавушкі з беластоцкай гарадской рэгістрацыяй. На чарговым панадворку гаспадар заводзіць трактар, але ён, як мяне раней паінфармавалі жанчыны, прыехаў толькі на дзень, таксама з Беластока. Частка панадворкаў роўна пастрыжаная газонавай касілкай, на шмат якіх панадворках не відаць слядоў пастаяннага чалавечага пражывання. Усе хаты традыцыйныя, не магу ніяк вылучыць нават хаты таго ўласніка вялікага статка кароў — відаць не ў харомах ён жыве, а ў такіх жа ўмовах, што і ягоныя суседзі.

Кіруюся ў бок Старой Луплянкі. Гэтай дарогі будзе каля кіламетра, калісь-калісь была яна падсыпана і з таго часу чыноўніцкі народ забыў пра яе. Рух на ёй яшчэ адбываецца, нават заўважаю незацерты яшчэ след конскіх капыт. Значыць, у наваколлі нехта і коніка трымае ды час-часом запрагае яго.

У Старой Луплянцы ціхай-ціхенькай вуліцай праехаў пажылы веласіпедыст і прычаліў да крайняй хаты. На адным з панадворкаў пустазелле ў чалавечы рост; з другога боку вуліцы прыкмячаю жанчыну, якая паблізу сваёй стадолы нешта паліць. Заходжу да яе паціцца вогнішчам.

Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Крыжы ў Лявоневічах

Пажылая жанчына, з мыліцай, тлумачыць мне, што паліць пластмасавыя бутэлькі. І тое вогнішча гарыць у старой бляшанай балеі, і гараць у ім не толькі бутэлькі, але і крыху загрэбенага лісця. У адказ на маё пытанне, чаму гэтакай тары не выносіць яна ў вясковы сметнік, тлумачыць, што той сметнік далекавата ды і яна ўжо не ў змозе так высока падняць рук, каб тым сметнікам пакарыстацца.

І крыху наракае, бо мае на што наракаць. Вось, для прыкладу, г.зв. сацыяльная дапамога, дзе дзяржава шчодра раздае грошы ўсялякім веселунам, абы толькі ў іх дзеці былі. Ды некаторыя жанчыны і родзяць дзяцей для лёгкіх грошай, не надта тымі дзяцьмі пасля клапоцячыся. А ў час яе дзяцінства такой распусты не было...

Дзяцінства ў маёй суразмоўніцы склалася сумна, рана страціла бацьку. Была яна з багацейшай сям'і. Саветы хацелі вывезці іх у ссылку, але не ўспелі, затое ўспелі забраць бацьку ў армію і ён загінуў на фронце. А пасля вайны прычапіліся за тыя гектары да маці, забралі маці ад дзяцей у турму, не надта клапоцячыся пра іх...

І так мне здаецца, што абедзве дзяржавы: і тая колішняя, што ад дзяцей з „паразітных" класаў грамадства забірала ўсё, разам з бацькамі, і тая цяперашняя, што празмерна шчодра поўніць левыя рукі некаторых бацькоў-веселуноў, у той дбайнасці-нядбайнасці пра дзяцей не надта ад сябе адлеглыя.

І расказала мне яшчэ жанчына пра іншых ашуканцаў і зладзеяў, што заглядаюць у апусцелую вёску дзеля нажывы на адзінокіх і нямоглых людзях. Добра яшчэ, што заглядаюць туды вайскоўцы з пагранаховы, бо яны адпуджваюць тых няпрошаных гасцей.

На панадворак зайшла іншая сялянка, якая выконвае там ролю апякункі пажылых людзей. І тая апякунка неўзабаве, мабыць, і сама будзе патрабаваць апекі. А хто стане яе апякункай — здагадвацца сумна.

Пагутарыўшы яшчэ крыху, пакідаю жанчын. Заглядаю на ўчастак насупраць, дзе калодзеж з паламаным калаўротам. Праз прабіўшуюся між кругамі крапіву яшчэ выглядае люстра вады. Вяртаюся на вуліцу, а сюды, следам за мной, выходзяць і мае нядаўнія субяседніцы.

Выгнаў іх за мною непакой, своеасаблівы клопат пра рэпутацыю. Старэйшыя людзі жылі ў эпоху яшчэ сяк-так стабільнай грамадскай расцэнкі, цяпер жа настаў час Чацвёртай Рэчы Паспалітай, якая сваёй мэтай ставіць разбурэнне існуючага ладу.

— А ці вы часам не запісалі нас, не будзеце паказваць у тэлевізары? — затрывожыліся жанчыны.

Можа не ў кожную мясцовасць праведзена вада, можа не ўсюды пракладзены правады тэлефона ці Інтэрнэту, але ўся краіна мае доступ да тэлебачання. А ў тое тэлебачанне пранік Big Brother і цяпер не надта вядома, на каго той монстр скіруе сваю камеру і што ў ёй пакажа. Калі б у Сталіна было тэлебачанне, паказвалі б у ім змаганне з кулацтвам так, як цяпер у нас паказваюць антыкарупцыйныя подзвігі...

Згаданы калодзеж стаіць на ўчастку родных згаданай ужо маёй субяседніцы і яна тым участкам апякуецца. А калодзежа не засыпала, бо можа яшчэ каму прыдасца. Пасеяла толькі крыху жыта дзеля прыдушэння пустазелля, бо ў будучыні хоча там пасадзіць агарод.

Далей іду зноў пустою вуліцай. З аднаго панадворка паказваецца юнак, а калі падыходжу да веснічак, выбягае з іх маладая жанчына без зубоў і вельмі ветліва адказвае на мае пытанні. Мабыць, гэта і ёсць той суб'ект, які карыстаецца поўняй жыцця і падтрымкай нашай дзяржавы. Жанчыне, мабыць, не страшныя ніякія жыццёвыя выклікі, бо бескампрамісную адвагу відаць з рота.

Заходжу ў іншую хату наведаць тамашняга старажыла, але чалавек, якому некалькі гадоў таму пайшоў дзесяты дзесятак, выбраўся крыху раней у грыбы. У гэтай хаце традыцыя трымаецца не толькі ва ўзросце яе сеніёра, не толькі ў экалагічным падкорме глебы, але і ў павазе да спадчыннай мовы — гэта адзіная хата ў Старой Луплянцы, у якой чытаюць „Ніву".

Будынак для прыёму малака, што калісь быў пастаўлены на канцы Старой Луплянкі, здаецца быць забытым ужо людзьмі. Помніць пра яго, бадай, адно толькі ўсёабдымны Час, які „злеўню", як і ўсялякае людское тварэнне, паволі перамяняе ў прах.

Праз Новую Луплянку падаюся ў бок Кітурыкаў. Па дарозе мінаю вёску Раманова, якая на сённяшні дзень асталася па сутнасці адно тапаграфічным паняццем. Лічаныя хаты раскінутыя па полі і лесе, некаторыя з іх абжытыя, некаторыя і зусім пакінутыя.

Дайшоўшы да дарогі з Падазеран у Ялоўку і не згледзеўшы праходу ў Кітурыкі, напраўляюся ў бок Ялоўкі. Трыццаць гадоў назад згаданая дарога пралягала па грунце сярод чыстага поля. Сёння на яе месцы жвіроўка сярод хваін і бярэзін ды рэштак поля, якое з'яўляецца мешанкай раллі і аблагоў.

Ялоўка з заходняга напрамку не была відавочная мне калісь з поля, а цяпер да таго ж абрасла яна з гэтага боку лесам. Але калі праз лапік поля з высакавольтнай лініяй паказаліся будынкі газанапорнай станцыі ў Кандратках, паказваючыя, што Ялоўка вось-вось, павярнуў я са жвіроўкі направа, у маладыя лясы, мяркуючы выйсці ў колішні горад з боку ранейшай школы.

Колішнія палявыя дарогі сёння абраслі лесам і зараслі травою, якую трэба пераадольваць як якую гразь. І гэтая хадзьба стала мне доўжыцца аж да занепакоенасці, ці не блукаю я ў напрамку далекаватых Шымкаў. Павярнуў я ў высакаватую ўжо бярэзіну і неўзабаве пабачыў першыя збудаванні Ялоўкі — крыжы на могілках. З'явілася сумная асацыяцыя, што неўзабаве Ялоўка згорнецца адно да могілак толькі.

III ☞ працяг

Разведка...

нічалі ўжо за машынай у пажарных улад: ваяводская камендатура адказала, што не мае сродкаў, а з галоўнай і зусім не атрымалі адказу...

Юрый Васілеўскі паказвае мне гістарычную даведку пра сваю вёску. Яе назва выводзіцца ад роду Вагановскіх ці Вагановічаў, якія ўжо ў XV стагоддзі сплаўлялі збожжа ў Гданьск. У канцы чарговага стагоддзя ў вёсцы была пабудавана царква. Сёлета каля ўвахода ў вульчанскую царкву адкрыта мемарыяльная табліца ў гонар замардаваных 31 студзеня 1946 года вазакоў, сярод якіх былі і мясцовыя прыхаджане: дзевяцярых з Краснага Сяла і адзін з Вулькі-Выганоўскай.

Заглянуў я ў краму, якая ў вясковых умовах выконвае часта ролю нефармальнай святліцы. І ў Вульцы-Выганоўскай траіх весялаватых мужчын — з выгляду бабылёў — забаўляюць размовай прадаўшчыцу. І мяне зачапляюць:

— Можа „дрынк"? — пытаюць.

Гасцінны ў нас народ. Калісь, мабыць, запрашалі да чаркі, сёння прапануюць „дрынк", а наступнае пакаленне нашых вяскоўцаў можа прывітае госця нейкай фразай накшталт „Дую ўэнта дрынк"...

Вяртаюся ў напрамку чыгуначнага прыпынка Сухавольцы. За пуцямі заўважаю дзве жанчыны, якія нешта здабываюць на запушчаным палетку. Заводжу з імі гутарку. Жанчыны прыехалі на веласіпедах з Вулькі-Выганоўскай збіраць зёлкі. Папраўдзе гэта не зёлкі, толькі каранішчы дзеравянкі — дуброўкі прамастойнай, а па-польску — kłącze pięciornika (Potentilla erecta). Дома яны тыя каранішчы сушаць, пасля тэлефануюць у Бельск і прыязджае скупшчык.

— Абрыдла сядзець у хаце, — тлумачаць мне, — а за зароблены такім чынам за дзень грошы можна аплаціць электрычнасць.

Каранішчы дзеравянкі апрача гаючага ўздзеяння маюць яшчэ і іншае бытавое прымяненне. Жанчыны сказалі мне, што такая дзеравянка выдатна паляпшае колер і смак самагонкі. Адно толькі нельга трымаць у гэтай вадкасці каранішчаў даўжэй за два тыдні. **Аляксандр ВЯРБІЦКІ**